Растуць спартсмены ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Успамін ляснічага Кубінкевіча ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 15 (2709) Год LIII | Беласток, 13 красавіка 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Палітвязень?

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

— Зараз пасля выхаду буду заклікаць польскія ўлады і буду да гэтага намаўляць уцекачоў з Беларусі, каб прыгледзеліся дамове паміж Польшчай і Беларуссю аб юрыдычнай дапамозе ад 1994 г. і яе рэнегацыявалі, — сказаў „Ніве" няпоўныя два тыдні да выхаду з беластоцкага следчага ізалятара часова арыштаваны беларускі ўцякач Ануфрый Рамановіч.

Гэты 65-гадовы былы функцыянер КДБ хадайнічае аб палітычным прытулку ў Польшчы, значыць, за атрыманне статуса ўцекача. Пасля прыходу да ўлады Аляксандра Лукашэнкі Рамановіч уключыўся ў дзейнасць у карысць апазіцыі. У 2001 годзе працаваў у выбарчым штабе апазіцыйнага кандыдата ў прэзідэнты Сямёна Домаша. У 2006 годзе адказваў за арганізаванне пікет і друк матэрыялаў у выбарчым штабе Аляксандра Мілінкевіча, цяперашняга старшыні Грамадзянскага руху „За Свабоду". Тры дні да канстытуцыйнага рэферэндуму быў арыштаваны. Адначасова з палітычнай дзейнасцю займаўся ён у Віцебску бізнесам у мэблевай галіне. Больш дакладна аб яго дзейнасці пісалі мы ў „Ніве" н-р 9 ад 2 сакавіка. Так выпадкова склалася, што зараз пасля нашага артыкула беластоцкі Акруговы суд выдаў пастанову аб часовым арыштаванні А. Рамановіча на 40 дзён. У абгрунтаванні Суд звярнуў увагу на тое, што гэтае рашэнне было такім, паколькі Ануфрый Рамановіч „jest poszukiwany przez organa ścigania Republiki Białoruś". Беларускае правасуддзе, без прадстаўлення польскаму боку якіх-небудзь доказных матэрыялаў, абвінавачвае яго ў *sprzeniewierzeniu* 5 050 долараў і — як гэта акрэслена — *ukryciu* даходаў сваёй фірмы, чым быццам бы паўплываў на страты дзяржавы з-за недахопу прыбытку з падаткаў у 45 тысяч долараў. Беластоцкі суд спаслаўся на дамову паміж РБ і РП ад кастрычніка 1994 г., якую падпісалі Станіслаў Шушкевіч і Лех Валэнса. Суд у абгрунтаванні прысуду аб часовым арышце заявіў: „Zachodzi uzasadniona obawa, że w przypadku zwolnienia wyżej wymienionego, będzie się on ukrywał przed wymiarem sprawiedliwości". Цяжка паверыць у такое абгрунтаванне хоць бы з-за факту, што пашпарт Ануфрыя Рамановіча быў „затрыманы" Установай па справах чужаземцаў, якая да канца сакавіка мела абмеркаваць яго прашэнне аб прысваенні яму статуса ўцекача. Да дня, калі выходзіць гэты нумар „Нівы", аб такім рашэнні нічога невядома, хоць парушаны ўжо ўсе магчымыя і прадбачаныя правам тэрміны.

Суд у Беластоку ў рашэнні аб часовым арыштаванні заявіў: „Працягваючыся адміністрацыйны працэс па наданні вышэйуказанаму статуса ўцекача не можа быць перашкодай у прыняцці рашэння наконт прэвенцыйнага сродка". Далей суд адзначыў, што арыштаванне неабходнае ў гэтым выпадку „w celu zapewnienia prawidłowego toku postępowania ekstradycyjnego". З гэтага можна меркаваць, што калі Ануфрый Рамановіч не атрымае ў Польшчы статуса ўцекача, будзе дэпартаваны ў Беларусь, а за злачынствы, у якіх яго абвінавачваюць, пагражае яму там 10 гадоў турмы.

— Паколькі я быў у КДБ і перайшоў у апазіцыйны лагер, невыключана, што рэжым Аляксандра Лукашэнкі паставіць перада мною нават абвінавачанне ў здрадзе дзяржаве, за што ў Беларусі пагражае смяротнае пакаранне, — сказаў мне ў час спаткання ў беластоцкім арышце А. Рамановіч.

2 красавіка Апеляцыйны суд у Беластоку на няяўным пасяджэнні (хоць далі нам згоду ўдзельнічаць у ім, старшыня судзейскага складу забараніў нам даваць якія-небудзь інфармацыі аб яго ходзе), не прыхіліўся да ягонай заявы аб звальненні з арышту, так што арыштант будзе сядзець да 15 красавіка.

Уся справа выклікае шмат сумненняў, пачаўшы з падазрэння ў парушэнні працэдур у час затрымання Рамановіча паліцыяй па заяве акруговага пракурора Войцеха Міхальчука, раніцай 6 сакавіка, ледзь тры дні пасля таго як мінула сапраўднасць Рамановічавай карты на часовае прабыванне ў Польшчы. Перш за ўсё сумніўнымі з'яўляюцца абвінавачанні беларускага боку. Як гэта бывала таксама і ў ПНР, шмат паказвае на тое, што ў палітычнай помсце шукаюцца або падрабляюцца доказы фінансава-эканамічнай натуры, спасылаюцца прытым на дамову паміж РП і РБ, якая была падпісана ў іншых палітычных умовах, якія былі на хвіліну дэмакратычныя, у Беларусі. Голас у абарону Ануфрыя Рамановіча ўзяў асабіста Аляксандр Мілінкевіч. У заяве, у якой просіць ён польскія ўлады аказаць 65-гадоваму А. Рамановічу палітычны прытулак, напісаў ён: „Я глыбока перакананы, што цяперашнія дзеянні беларускіх улад у адносінах да Ануфрыя Рамановіча гэта праслед па палітычных прычынах. Гэта не першы выпадак фальсіфікавання беларускімі дзяржаўнымі службамі абвінавачанняў супраць дзеячаў беларускай апазіцыі, якія ўцяклі перад рэпрэсіямі ў Польшчу".

— Ён нам вельмі дапамагаў, а мы памаглі яму ўцячы з Беларусі, — дадаў А. Мілінкевіч у тэлефанічнай размове з нашым тыднёвікам.

Дзень да нашага спаткання ў турме і дзень пасля прысуду Апеляцыйнага суда, Ануфрыя Рамановіча перавялі з камеры на 14 чалавек (са звычайнымі крымінальнікамі) у чатырохмесную (таксама з такімі ж асуджанымі). Арыштанту выкананы былі комплексныя медыцынскія даследаванні.

— У мяне да гэтага сядзення ў турме філасофскія адносіны. Магу параўнаць, як сядзіцца тут, і як у Беларусі. Тут кажуць да мяне: *proszę pana*, а там нахабна *тыкаюць*. Я баяўся толькі тады, калі паліцыя везла мяне ў ваяводскую камендатуру. Спачатку думаў, што можа гэтыя паны вязуць мяне ў консульства і там я буду выкрадзены. Пасля, як павярнулі ў вуліцу Сянкевіча, дык падумаў, што даставяць мяне проста на мяжу, — расказваў мне пакорна. — У мяне жаль да польскіх улад, што прымяняюць яны дамову з Беларуссю, якую ілжыва выкарыстоўваюць Лукашэнка і яго сістэма.

Віцэ-маршалак Сената Збігнеў Рамашэўскі, у якога мы спыталіся ці ёсць мачымасць рэнегацыяцыі гэтай дамовы, сказаў:

— Дэнансацыя міжнароднага дагавора і яго рэнегацыяцыя могуць пацягнуць за сабой сур'ёзныя паслядоўнасці.

„Ніва" 15 красавіка будзе спадарожнічаць Ануфрыю Рамановічу ў час, калі ён будзе выходзіць (магчыма) са Следчага ізалятара.

„Мянты" і „менцюкі" ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Міліцыянтаў у Беларусі не любіць ніхто. Характэрна, што нават найменне „міліцыянт" ці „міліцыянер" практычна знікае з паўсядзённага побытавага лексікону, застаючыся пераважна для службовага і газетнага ўжытку. Паўсюдна, спрэс і кругом ужываецца некалі чыста зэкаўскае слова „мент", слова з адпаведным грэблівым і зневажальным адценнем...

Ягор Хлябіч ☞ 4

Міра ЛУКША

Журобічы ☞ 5

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Тайны пятнаццаці трунаў... ☞ 9

Юзэф МАЦКЕВІЧ

Таленты ў чамадане ☞ 12

Ілона КАРПЮК

9 770546 196000

„Мянты” і „менцюкі”

Міліцыянтаў у Беларусі не любіць ніхто. Характэрна, што нават найменне „міліцыянт” ці „міліцыянер” практычна знікае з паўсядзённага побытавага лексікону, застаючыся пераважна для службовага і газетнага ўжытку. Паўсюдна, спрэс і кругом ужываецца некалі чыста зэкаўскае слова „мент”, слова з адпаведным грэблівым і зневажальным адценнем. Яшчэ гадоў дваццаць таму многія школьнікі на тэму школьнага сачынення „Кім я хачу стаць, калі вырасту” пісалі пра мару быць міліцыянтамі — следчымі ці ахоўнікамі правапарадку. Так было, дзякуючы найперш савецкаму кіно, якое гераізавала працу тых, чыя „служба и опасна и трудна и на первый взгляд как будто не видна”. Кіно стварала легенды, якія рэзка кантраставалі з паўсядзённым жыццём.

Міліцыянт ва ўспрыманні сённяшняга абывацеля — гэта найперш не абаронца пакрыўджаных і паборнік справядлівасці, не гарант вашых правоў і грамадскага спакою. Сённяшні міліцыянт у свядомасці пераважнай бальшыні грамадзян — гэта карнік. Толькі ў розных „милицейских вестниках” рэйтынг даверу да гэтай службовай катэгорыі высокі. Насамрэч у насельніцтва сярод структуры дзяржаўных службоўцаў сённяшні міліцыянт выклікае найменшы давер і павагу. Адны грамадзяне іх баяцца, іншыя ненавідзяць, трэція ставяцца з пагардай.

Асабліва не любяць людзі, найперш кіроўцы аўтамабіляў (адсотак якіх у краіне расце ледзь не з геаметрычнай прагрэсіяй) міліцыянтаў з аўтадарожнай інспекцыі, так званых даішнікаў. Ёсць нават народная прымаўка — „развялося іх, як сабак” (хоць сабак відавочна меней). Шырокі розгалас па Беларусі атрымала нядаўняя гісторыя з так званым „жывым шчытом”. Для тых, хто не ў курсе справы, каротка яе перакажу. Больш двухсот кіламетраў пераследавалі даішнікі машыну, на якой ехаў п’яны малады чалавек са сваёй нявестай. Урэшце непадалёк сталіцы легкавік, якім кіраваў малады дэбіл па прозвішчы Мянцюк, удалося спыніць. Але якім чынам? Міліцыянты паставілі на дарозе „жывы шчыт” з некалькіх прыватных машынаў, пасажырам якіх не дазволілі нават выйсці з салона. Адбылася аўтамабільная аварыя, некалькі машын было сур’ёзна пабіта, а людзей траўмавана. Дзякуй Богу, што яшчэ абышлося без трагічных наступстваў (а ў адной машыне сядзела нават дзіця!). Ратуючы „гонар мундзіру”, высокае міліцэйскае начальства доўгі час апраўдвалася рознымі спосабамі. Але праўду схаваць не ўдалося. Пасля выявілася, што гэты прыклад зусім не адзінкавы, усплылі іншыя аналагічныя гісторыі, дзе даходзіла да калецтва людзей. А ў гісторыі з Менцюком гэта яшчэ не ўсё. На злоснага парушальніка справядліва завялі крымінальную справу, але той працягваў пачувацца героем — паспеў ажаніцца, з’явіцца на першых старонках беларускіх газет і нават з’ездзіць у Маскву на папулярнае ток-шоу (нягледзячы на падпіску аб нявыездзе). Пасля, па словах сваякоў, вярнуўся ў Беларусь і праз некалькі дзён... знік бясследна з краіны. Доблеснай міліцыі было папросту не да яго, прыярытэт быў аддадзены іншаму — паляванню на актывістаў дэмакратычнага руху. Паводле афіцыйных заяваў па Менцюку не абвешчаны нават вышук.

Па ўсім відаць, што міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Навумаў найбольш займаецца дзвюма справамі — змаганнем з дэмакратычнай апазіцыяй і хакеем. А між тым толькі па афіцыйнай статыстыцы колькасць, прыкладам, наўмысных забойстваў у Беларусі ў 2007 годзе склала 791 (у 2006 годзе было намнога менш — 725). З году ў год расце колькасць нераскрытых цяжкіх злачынстваў — тых жа забойстваў і згвалтаванняў.

За апошнія гады часцяком даводзілася сустракаць людзей, якія добраахвотна пакінулі міліцэйскую службу з-за невыноснасці парадкаў, якія там пануюць — адзін не мог біць непаўналетніх (па яго словах, гэта звыклая практыка), іншага замучыла планаванне (!) колькасці выяўленых і раскрытых правапарушэнняў і бюракратычная справаздачнасць. Людзі звальняліся таму, што праца міліцыі скіравана найперш не на прэвентыўнасць злачынстваў і правапарушэнняў, а менавіта на карнасць. Канешне, ёсць сярод міліцыянтаў шмат і прыстойных людзей (найбольш сярод ніжэйшых чыноў), але гэта не мяняе галоўнай сутнасці сённяшняй міліцыі, якая служыць сёння не грамадзянам, а дзяржаўнай наменклатуры.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

На вобраз і падабенства

Ішоў я з Дзядковіч у Журобічы: было пяць вёрст і амаль усе лесам. Ішоў па абочыне важнай асфальтавай шашы. Тая шаша вядзе з Прыбалтыкі на поўдзень Еўропы і можна яе нават назваць не краёвай, не ваяводскай ці павятовай, але нават еўрапейскай. Рух на ёй байкаваты, як і выпадае для такога рангу магістралі. Маю ўвагу ў тым краявідзе прыцягнула не багацце транспартных сродкаў, не веер іх разнавіднасці, толькі зусім прыземленая частка таго пейзажу.

Гледзячы на само дарожнае палатно, маю ўвагу прыцягвалі чорныя асфальтавыя латы заміж выезджаных каляін на такім жа асфальтавым, але шэрым ад зношанасці насціле. Шаша нагадвала ў тым месцы карціну мастака-кубіста, у якога была ў палітры толькі чорная фарба, якую ён клаў на палатно спачатку быццам развёўшы вадою — святлейшай, а пасля наносіў прамавугольнікі густой чарнаты.

З другога боку маёй дарожнай абочыны — у лесе, таксама быў нейкі мастацкі парадак. Яшчэ ў той час анемоны не паказаліся, а сончыкі ўдалося мне пабачыць толькі ў адным месцы, аднак лес радаваў мяне іншым узорам, які красаваўся побач дарогі, у прыдарожным рове, быццам той узор быў прыцягнуты туды нейкім мастацкім магнітам да асфальтавага кубізму. У лясным рове красавалася разнаўзорная тара. Можа хто падумаць, што я хачу саромецца за засмечанасць нашага лесу побач прэстыжнай міжнароднай дарогі, аднак канфузіцца не трэба, калі перанесці нашу ўяву, напрыклад, у Афіны ці Неапаль перыяду забастовак камунальных работнікаў.

Магчыма, што гэтакі наш лясны краявід можна было пабачыць толькі ў гэтым годзе, як нейкую камету на нябесным купале, а праз некалькі чарговых гадоў тая тара, зноў быццам камета, не будзе паказвацца на від. Мяркую гэтак таму, што прыдарожную тару, у прынцыпе штогоду, падбіраюць у першы дзень вясны вучні, якіх у рамках экалагічнага навучання вядуць у лес настаўнікі, каб пры нагодзе захіліць іх ад традыцыйных у гэты дзень школьных прагулаў. Сёлета першы веснавы дзень выпаў у велікодны школьны перапынак і чарговае такое супадзенне будзе залежаць ад тэалагічна-астранамічных, як за каметамі, назіранняў. Магчыма, што найбліжэйшыя весны будуць заглядаць у чысцейшы лес.

Але магчыма таксама, што я ў гэтых разважаннях памыляюся і наяўнасць тары ў прыдарожнай палосе будзе ўзрастаць. Кардончыкі з-пад папяросаў доўга не паляжаць, яны будуць адносна хутка разрушаны сіламі прыроды. Крыху даўжэй будуць бараніцца банкі з-пад піва. Аднак найбольш побач рухавых дарог пластмасавай тары з-пад напояў. Гэтакія бутэлькі ляжаць побач згаданай мною шашы прыблізна кожныя дзесяць метраў. Гэта толькі ў адным рове, з аднаго боку шашы; столькі ж пластмасавай тары і з другога боку. Варта яшчэ дадаць, што гэтыя ўпакоўкі даволі трывалыя, прыродаўстойлівыя.

Калі песімістычна глянуць у будучыню, тады ў ейнай дынаміцы колькасць тары ў прыдарожных равах будзе расці і праз нейкі час на метр рова выпадзе па адной бутэльцы і чым далей у будучыню, тым іх можа быць больш. Магчыма, што іх нехта падбярэ з лясных равоў, але ж тая тара такім чынам не прападзе, толькі памяняе сваё месца, трапіць на нейкую звалку, становячыся будматэрыялам для адкідавых тэрыконаў, гэтакіх пірамідаў, якія ўзводзіць сённяшні чалавек на памятку будучым пакаленням.

Калі ж глянуць у другі бок, у мінулае, тады немагчыма будзе ўбачыць не толькі пластмасавыя бутэлькі, але і ўсялякую іншую тару. Старазапаветныя гвардзейцы Гедэона пілі ваду, набіраючы яе рукамі, апошняе ж апалчэнне карысталася вадаёмам „какъ локаетъ песъ”. У тую эпоху людзі не пакідалі пасля сябе такіх памятак, як гэта зараз робіць наш цывілізаваны чалавек. Нашы продкі пакінулі нам не толькі егіпецкія піраміды ці кітайскую сцяну, яны пакінулі нам чыстую прыроду.

Наш сучасны чалавек, які едзе самаходам, які ў тым самаходзе праводзіць шмат свайго жыцця, не запыніцца побач вадаёма і не нап’ецца з яго вады, бо тая вада можа быць забруджаная, небяспечная. Таму ў дарогу набірае ён тару са спажывай, якімі пасля спажыцця „асвянчае” прыдарожныя равы.

Тара астаецца, бо яна з гігіенічных прадпасылак прызначаецца толькі для аднаразовага ўжытку. Для чарговых прадуктаў трэба вырабіць новую і чалавек шукае сыравіны для гэтай і іншай масавай вытворчасці, капаецца дзеля яе ў зямлю, каб пасля тую зямлю, сваё прыроднае асяроддзе забрудзіць. І ці ж такім чынам наш *Homo sapiens* не выглядае крыху як, далікатна кажучы, дзік або яго хатняя сваячка?

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Гусі за вадою

Пры нагодзе прысваення беларускай Гміннай радай звання ганаровага грамадзяніна Белавежы Яраславу Абрамаву-Неверлі, прыгадаўся мне адзін эпізод, які меў месца ў Беластоку ў дзевяностых гадах мінулага стагоддзя. Гэты літаратар, сын іншага выдатнага пісьменніка — Ігара Неверлі (яго імя носіць ад некалькіх дзён Гмінная бібліятэка ў Белавежы) напісаў у той час адну са сваіх п’ес, якая пасля карысталася вялікай папулярнасцю на польскіх сцэнах, а менавіта „Gęsi za wodą”. Пасля напісання п’есы Яраслаў Абрамаў-Неверлі з Таронта, дзе жыве, запрапанаваў яе для пастаноўкі тагачаснаму дырэктару Драмтэатра імя А. Вянгеркі Анджэю Якімцу. Прапрэм’ера адбылася на малой сцэне тэатра. Аднак ужо раней вакол „Гусей за вадой” разбушавалася бура. Нейкая Дарота Фрасункевіч з існуючага тады Згуртавання аховы радыёслухача і тэлегледача, ды яе паплечнік, у той час сенатар АВС (у папярэднім скліканні парламента — ЛПР; цяпер па-за парламентам) Ян Шафранец, катэгарычна патрабавалі зняць пастаноўку з афішы, хоць на ёй яшчэ не была, а самі яе не бачылі, і, як заявілі, і не думаюць яе паглядзець. Абое і іхнія аднадумцы, на якіх спасылаліся, адчувалі сябе абуранымі амаральнасцю драмы. Дзея адбываецца там у турме, у якой даходзіць да неадназначных эратычных сітуацый нязгодных — як казалі пратэстуючыя — з агульнапрызнанымі нормамі.

З-за справы Яраслава Абрамава-Неверлі Беласток стаў пачынальнікам спроб увядзення бытавой цэнзуры ў мастацтве ў пасляпээнэраўскай Польшчы. Дарэчы, падобныя спробы пазней у Беластоку ў некаторых колах карысталіся немалой папулярнасцю і датычылі, напрыклад, галерэі „Арсенал”. Прытым у час, калі ў Беластоку ставіліся „Гусі за вадой”, абураныя гэтым фактам не звярталі ўвагі на мастацкія каштоўнасці драмы ды пастаноўкі і сапраўднае яе пасланне. Так было пасля ў іншых „выпадках”.

Прыгадалася мне гэтая цэнзарская спроба таксама пры нагодзе іншай акцыі ў апошніх днях. Вось студэнты і працаўнікі беластоцкай Вышэйшай школы публічнай адміністрацыі заклікалі дырэктара Філармоніі і оперы ў Беластоку ды падляшскага маршалка „адмовіцца ад арганізавання канцэрта традыцыйнай кітайскай музыкі ў выкананні аркестра Кітайскай дзяржтэлерадыёкампаніі”. Вядома, справа была ў салідарнасці з Тыбетам і адмове прамоцыі „артыстаў рэжымнага радыё і тэлебачання ў Пекіне”. Мастацтва гэта мастацтва, а палітыка — палітыка, — такую думку можна было выснаваць з пазіцыі дырэктара філармоніі і маршалка, якія праігнаравалі заклік ВШПА. І на маю думку мелі рацыю: ёсць шматвяковая тыбецкая культура, але ёсць і шматвяковая кітайская, не тая, звязаная з сучасным палітычным рэжымам, але, напрыклад, з дынастыяй Тан.

І ўрэшце ў закліку да маршалка прачытаў я, вытрашчыўшы ад здзіву вочы, чаму якраз ён да яго адрасаваны: „Успамінаючы пра вашу ангажаванасць у змаганне за свабоду і дэмакратыю на Беларусі ды ваш удзел у акцыях пратэсту «Салідарныя з Беларуссю», якія разам мы арганізавалі пад консульствам Беларусі ў Беластоку...” Аж хочацца спытацца: „Co ma piernik do wiatraka?” Ведаеце, можа, мяне ўжо падводзіць памяць, ды нейкага асаблівага ангажавання ў беларускую справу самога маршалка Яраслава Дважанскага не памятаю, хоць, без сумнення, ягоныя аднадумцы (Грамадзянская платформа), такое блізкае кіраўніцтву ВШПА, сапраўды ініцыявала акцыі салідарнасці з Беларуссю.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Аляксей МАРОЗ

Поспехі на спартыўных спаборніцтвах вучняў Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім не з'яўляюцца рэдкасцю. Вучні падставовай школы і белгімназісты дабіваліся поспехаў у валейбольных, гандбольных і іншых калектыўных гульнях, а таксама часта перамагалі ў розных відах лёгкай атлетыкі ў Падляшскім ваяводстве, а нават займалі добрыя месцы па лёгкай атлетыцы на агульнапольскіх спаборніцтвах. Галоўная заслуга тут здольнай моладзі і настаўнікаў фізкультуры, якія заадно з'яўляюцца трэнерамі маладых спартсменаў. Сам дырэктар Васіль Ляшчынскі трэніруе школьную гандбольную каманду і разумее, што без доўгай і сістэматычнай трэніроўкі не будзе заўважальных поспехаў у спорце ды стараецца стварыць добрыя ўмовы для пазаўрочных спартыўных заняткаў.

Фота Валеры МЕШЧАРАКОВА

РАСТУЦЬ СПАРТСМЕНЫ

Вучаніцы з „тройкі" вяртаюцца з плавальных спаборніцтваў з кубкамі. Зверху ад левага боку: Агнешка Швед, Сільвія Флёрчук і Марыя Колас, а знізу ад левага боку: Юлія Панютыч, Анна Клімчук, Ізабела Ладняк, Аляксандра Сарокін і Малгажата Мешчаракоў

Перамагалі на міжнародных спаборніцтвах

Пасля ваяводскага фіналу валейбольных гульняў, які 14 сакавіка адбыўся ў Беластоку, калі дзяўчаты з „тройкі" пад кірункам Юрыя Чыквіна занялі трэцяе месца (пісалі мы ў „Ніве" № 12 ад 23 сакавіка), чарговых поспехаў вучняў з гэтай жа школы прыйшлося чакаць толькі тыдзень. З 20 па 22 сакавіка вучні Падставовай школы № 3 з Бельска выступілі ад Гарадскога плавальнага клуба „Воднік" на Адкрытым чэмпіянаце дзяцей і моладзі (ва ўзросце 10-15 гадоў) у Брэсце ў міжнароднай кампаніі і вярнуліся адтуль з кучай медалёў.

— Прэстыжна было нам прымаць кубак і медалі з рук шматкратнай чэмпіёнкі Беларусі, фіналісткі Чэмпіяната Еўропы 1995 года і фіналісткі Алімпійскіх гульняў у Атланце Інгі Бародзіч, — заяўляе старшыня бельскага плавальнага клуба і заадно настаўнік фізкультуры ў „тройцы" Валеры Мешчаракоў.

Каманда з Бельска-Падляшскага, у якой з ліку 15 выступаючых маладых плыўцоў ажно 13 вучняў было з „тройкі", заняла ў цэлым другое месца. Вучні, якіх трэнерам з'яўляецца Дар'юш Ляшэвіч, на працягу трох дзён плавалі на розных дыстанцыях, рознымі стылямі, супольна ў эстафэце і таму некаторыя асобы прывезлі нават па некалькі медалёў, а выдатная большасць дзяўчат і хлопцаў з „тройкі" ў Брэсце паправіла у Брэсце свае жыццёвыя вынікі. Самых вялікіх поспехаў з ліку вучняў „тройкі" дабілася Анна Клімчук, якая заняла там першае, другое і трэцяе месцы. Малгажата Мешчаракоў заняла першае і трэцяе месцы, а Агнешка Швед заняла, між іншым, другое і трэцяе месцы. Ізабела Ладняк і Сільвія Флёрчук занялі другія месцы, а Юлія Панютыч — трэцяе. Сярод выступаючых за ўсходняй мяжой вучняў „тройкі" былі яшчэ Дам'ян Асташэўскі (чацвёртае месца), Аляксандра Сарокін (пятае месца), Марыя Колас (пятае месца) і Міраслаў Мешчаракоў (дваццатае месца).

— Калі плаваем на кароткіх дыстанцыях, вельмі важна каб удала нырнуць у ваду і адразу далёка адплысці, а пасля апрача хуткасці плавання трэба звяртаць увагу, каб хутка рабіць павароты, — тлумачаць Оля Сарокін і Агнешка Швед, якім лепшыя вынікі атрымоўваюцца на карацейшых дыстанцыях.

— У час спаборніцтваў вельмі важная справа — лічыць колькі разоў пераплылося басейн і ўмела раскласці сілы, каб у канцы перамагчы, — заяўляюць Анна Клімчук і Малгажата Мешчаракоў, якія перамагалі на даўжэйшых дыстанцыях.

На Адкрытым чэмпіянаце Коўна (Літва), у якім 28 лютага прымалі ўдзел 374 спартсмены з 17 клубаў і школ Літвы і Польшчы, плыўцы з бельскай „тройкі" таксама занялі прызавыя месцы. Анна Клімчук двойчы здабыла сярэбраныя, а Ізабела Ладняк два разы бронзавыя медалі. Каб дабіцца такіх поспехаў у Брэсце і Коўне, вучні пятага і шостага класаў вельмі інтэнсіўна трэніраваліся. Частка бельскіх маладых плыўцоў сустракаецца са сваім трэнерам і плавае па 4 разы ў тыдзень, а частка вучняў займаецца трэніроўкай на басейне нават па 6 разоў у тыдзень.

— У ходзе адной трэніроўкі вучні падставовай школы пераплываюць прыблізна па 1200-1400 метраў, — удакладняе Валеры Мешчаракоў.

Аднак мае суразмоўцы не наракалі на цяжкія трэніроўкі, а наадварот, паказалі сваё захапленне воднымі гульнямі.

— Каб былі поспехі ў час спаборніцтваў, трэба сістэматычна хадзіць на трэніроўкі і многа плаваць, — заяўляюць бельскія дзяўчаты.

— Самае важнае — спачатку навучыцца вельмі добра плаваць кожным стылем, — гаворыць Аляксандра Сарокін.

— Пасля трэба многа трэніравацца, каб быць выносліым і хутка плаваць, — дабаўляе Агнешка Швед.

У гэтым школьным годзе каманды дзяўчат і хлопцаў з Бельскага плавальнага клуба занялі пятыя месцы ў час Гульняў Падляшскага ваяводства па плаванню.

— Хаця мы на палову крока астаемся яшчэ ззаду за тымі клубамі, што існуюць па 10-20 гадоў, то ёсць вялікая надзея дагнаць іх і здабываць медалі на ўзроўні ваяводскіх спаборніцтваў у бліжэйшай будучыні. Вучні падставовай школы маюць ужо шанц перамагаць будучы гімназістамі, — кажа старшыня плавальнага клуба Валеры Мешчаракоў.

— Я вучылася плаваць у Беларусі, непадалёк Гродна, адкуль вывозіцца мой бацька, — заяўляе Аляксандра Сарокін, якая ўжо трэці год трэніруецца на бельскім басейне. Яе сяброўка Малгажата кажа, што вучылася плаваць на Чорным моры, непадалёк ад месца, адкуль вывозіцца яе бацька. Анна Клімчук паведамляе, што спачатку плавала на Балтыйскім моры, а Агнешка Швед — на азёрах у Польшчы. Усе мае суразмоўцы рады, што ў Бельску ёсць крыты басейн, на якім могуць трэніравацца. Звяртаюць яны ўвагу, што плаванне спрыяе захаванню добрага здароўя, а ў час трэніровак могуць прыемна праводзіць вольны час.

— На 44 вучняў, якія займаюцца ў Гарадскім плавальным клубе „Воднік", ажно 27 дзяўчат і хлопцаў — вучні „тройкі", — кажа настаўнік гэтай жа школы Валеры Мешчаракоў. — Калі будзе згода адпаведных улад, ёсць планы адкрыць у нашай школе з верасня гэтага года спартыўны клас з інавацыйнай праграмай навучання, накіраванай на плаванне. Зараз 12 вучняў трэціх класаў „тройкі" займаецца трэніроўкамі ў нашым плавальным клубе і на аснове іх быў бы створаны спартыўны клас.

Частка дзяўчат з плавальнага клуба займаецца таксама іншымі відамі спорту. Напрыклад, Анна Клімчук іграе яшчэ ў валейбол, а Агнешка Швед штурхае ядро. Вучаніцы бачаць, што трэніроўкі без вады таксама памагаюць у плаванні. Аднак цяжка будзе ім у будучыні займацца рознымі відамі спорту, бо трэба будзе перш за ўсё знаходзіць час на адукацыю.

Іншыя поспехі

— Эстафета дзяўчат з падставовай школы, якімі апякуецца Юрый Чыквін, заняла трэцяе месца ў ваяводстве ў бегах па перасечанай мясцовасці. Гімназісты, якімі апякуецца Уладзімір Баравік, дабіліся добрых вынікаў па лёгкай атлетыцы ў ваяводстве. У час чэмпіянату Бельска-Падляшскага ў закрытым памяшканні вельмі добрых вынікаў дабіліся Рафал Баравік і Пётр Саўчынскі, — пералічвае поспехі сваіх вучняў дырэктар Васіль Ляшчынскі. — Перад намі фінальныя змаганні гандбалістаў у Падляшскім ваяводстве, у якіх прыме ўдзел каманда хлопцаў з нашай падставовай школы, якімі апякуецца Пётр Стасюк. Гімназісты, якімі апякуецца Уладзімір Баравік, таксама будуць яшчэ змагацца ў гандбольным фінале нашага ваяводства, а дзяўчаты з гімназіі, якіх я трэніраю, закончылі спаборніцтвы на сёмым месцы, паколькі галоўны наш ігрок Агнешка Хомюк мусіла сысці з пляцоўкі з траўмай.

Гімназіст „тройкі" Рафал Баравік пасля шматгадовай трэніроўкі пад кірункам свайго бацькі і настаўніка фізкультуры Уладзіміра Баравіка, выступаючы ад імя Спартыўнага клуба „Падляшша", у катэгорыі малодшых юніёраў нядаўна стаў віцэ-чэмпіёнам Польшчы па сямібор'і, а раней на чэмпіянаце Польшчы па лёгкай атлетыцы юнакоў, які адбыўся ў мінулым годзе, заняў трэцяе месца ў час бегу з бар'ерамі на дыстанцыі 110 метраў, а на чэмпіянаце Польшчы ў закрытым памяшканні ў час бегу з бар'ерамі на 60 метраў заняў другое месца. Белгімназісты Адрыян Максімовіч і Агнешка Хомюк, якіх трэнерам з'яўляецца таксама Уладзімір Баравік, перамагалі па лёгкай атлетыцы ў Падляшскім ваяводстве і дабіліся прыстойных вынікаў у краіне.

— Каб былі поспехі вучняў, патрэбныя добра падрыхтаваныя да выконвання сваёй работы настаўнікі фізкультуры. Спраўджаюцца ў рабоце настаўнікі, якія самі дабіваліся поспехаў у розных дысцыплінах спорту, а зараз не спыніліся на адукацыі, якую здабылі ў вышэйшых установах, але стараюцца сачыць за тым, што новае ў спорце і яго прымяненне дае задавальняючыя рэзультаты. Нашыя настаўнікі фізкультуры і заадно трэнеры нашых дзетак і моладзі працуюць грунтоўна і ёсць гэтага рэзультаты. Не хапае нам сродкаў на выезды на трэніроўкі на якасных спартыўных аб'ектах, — кажа дырэктар Васіль Ляшчынскі. — У нашай школе самая вялікая ў Бельску-Падляшскім спартыўная зала. Гэта дае магчымасць грунтоўна трэніравацца. Аднак паяўляюцца таксама складанасці, бо пхаюцца да нас з многімі спаборніцтвамі і цяжка тады праводзіць свае заняткі. Летам вучні трэніруюцца на школьнай спартыўнай пляцоўцы, якая малаватая для гімназістаў. Трэніроўкі праходзяць таксама на гарадскім стадыёне, але там неадпаведная дарожка для бегаў.

Неабходная прафілактыка

Рак — адна з найбольш пагражальных хвароб цывілізаванага свету. На думку анколагаў хваробу можна адолець, калі яна будзе своечасова выяўлена. Неабходнае тут прафілактычнае навучанне. Гэта задача медычных служб, як і няўрадавых устаноў. Не менш важную ролю могуць у гэтай справе адыграць СМІ.

На Беласточчыне справай займаецца Ваяводскі асяродак каардынацыі прафілактычнай праграмы, які змяшчаецца пры Анкалагічным шпіталі ў Беластоку па вуліцы Аградовай, а ў паветах — староствы. Гэтыя апошнія, у рамках праграмы аховы здароўя арганізуюць абследаванні. На Гайнаўшчыне, напрыклад, у мінулым месяцы праводзіліся мамаграфічныя абследаванні: бясплатныя для жанчын ва ўзросце 50-69 гадоў, астатнім трэба было заплаціць 60 зл. Паводле даных Амбулаторыі прафілатыкі і дыягнозу Т.Н.Н. у Беластоку, было праведзена 805 абследаванняў, прычым выяўлена адно захворванне на рак, а ў дваццаці выпадках узнікла падазронасць захворвання, што стварае аснову для далейшай дыягностыкі.

А як да гэтай справы паставіліся пацыенткі паасобных гмін Гайнаўшчыны паказвае статыстыка: Чыжы — 46 абследаванняў, Нарва — 49, Дубічы-Царкоўныя — 53, Нараўка — 54, Кляшчэлі — 54, Белавежа — 57, Чаромха — 61 і Гайнаўская гміна — 431. Вялікую пагрозу захворвання ракам лёгкіх, паводле медыкаў, стварае дрэнная звычка курэння. Гэта асноўны аргумент прафесара Збігнева Рэлігі. Як канстатаваў былы міністр аховы здароўя, у васьмідзесяці працэнтах пацыенты з'яўляюцца да лекара з хваробай, якая далёка зайшла. У такіх выпадках памяншаецца шанц пераадолення хваробы. Варта аб гэтым памятаць.

Уладзімір СІДАРУК

Агратурызм

Агратурыстычныя кватэры ў Нараўчанскай гміне (Гайнаўскі павет) дзейнічаюць м.інш. у Новым Ляўкове, Старым Ляўкове, Нараўцы, Грушках, Плянце, Масеве, Новай Луцэ, Міклашэве, Сушчым Барку, Елянцы, Свінароях і Заблотчыне. Нядаўна было выбрана новае праўленне Агратурыстычнага аб'яднання „Зубр". Старшынёю выбралі Яўгена Валкавыцкага, намеснікам старшыні Лену Харкевіч, сакратаром Андрэя Карчэўскага і скарбнікам Міраслава Зяневіча ды членамі праўлення — Барыса Казлоўскага, Яўгена Кавальчука і Яна Гвая.

Зімою кватэранаймальнікі ў Новым Ляўкове прапануюць турыстам прагулкі на санках (кулікі), у Плянце ўвесь час — дранікі і бульбяную бабку, у Сушчым Барку — жытні хлеб. У Новым Ляўкове можна папарыцца ў сауне, змалаціць цэпам жыта, пачысціць яго ў арфе-веялцы, змалоць зерне ў жорнах, замясіць цеста ў дзежцы ды самастойна спячы хлеб у печы. У Старым-Ляўкове можна пакарыстацца калаўроткам, кроснамі, развітушкамі і матавіламі. У Плянце можна купіць шмат якія сушаныя лекавыя зёлкі. Турыстам можна паказаць баброў на рэчцы Нараўцы ды дрэвы-помнікі ў лясах Белавежскай пушчы.

(ян)

Ягор Хлябіч — ткач-паэт у Беластоку

Ягор Хлябіч (у цэнтры) сярод Хлябічаў на выстаўцы сваіх ткацкіх твораў

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Ягор Анатоль Хлябіч — адно з першых паэтычных прозвішчаў Беласточчыны, якое паявілася на старонках „Нівы" і ў першым зборніку „Белавежы" „Рунь" у 1959 годзе. Пісаў ён вершы для дзяцей ды пра традыцыю. Дасылаў свае творы малады хлопец са свае вёскі Валілы. Адтуль пайшоў вучыцца ў свет — штудзіраваў фізіку, працаваў у школе, пасля навукаў не закончыў адукацыі на філасафічна-гістарычным факультэце Вроцлаўскага універсітэта, рабіў дактарат па гісторыі, таксама паслядыпломныя спецыяльнасці ў Педагагічнай акадэміі ў Кракаве і Акадэміі спецыяльнай педагогікі ў Варшаве. Шмат гадоў прысвяціў педагагічнай практыцы, м.інш., быў куратарам асветы ў Вроцлаве, вёў навучанне ў спецыяльным школьніцтве. Ужо ў роднай хаце цягнула яго да мастацтва. Узіраўся ў матуліна тканне, спачатку пайшоў вучыцца ў мастацкі ліцэй.

Прыгадваецца тут ягоны верш „Кудзеля", які трапіў у анталогію найлепшых паэтычных твораў беларускіх аўтараў Беласточчыны „Букет Белавежжа"; гэты верш, дарэчы, Ягор Хлябіч прадэкламаваў на вернісажы выставы сваіх прац:

Барадатую кудзелю
Бабулечка прала,
А кудзеля барадою
Сівай патрасала.

Ўдзячна прасніца скрыпела,
Быццам прыпявала:
— На кашулю хопіць, хопіць,
На пасцілку — мала...

Ягор сваё майстэрства дасканаліў у Майстэрні тканіны „На Ятках" у Вроцлаве, завяршаючы Студыю мастацкага ткацтва. Прафесар Ева Марыя Парадоўская-Вэршлер, захопленая ягоным мастацтвам, першым захапленнем перад падарожжамі, прыкмячае: „Тут, Ягор, практыкуючы ткацкія спляценні — вяртаўся думкамі ў маленства. У Ягора Хлябіча свой свет мастацкіх дзеянняў. Ягоная далікатная і спакойная натура, засяроджаная на мастацтве, стварае з яго анклаў, якім кіруе дысцыпліна і рашучасць. Усё, што здавалася б быць складаным, у далонях Ягора становіцца простым, лёгкім і гожым. Ці ж гэта не прыродны талент? Захапляецца падарожжамі, запамятвае вачыма гісторыка ўражанні толькі яму падуладныя і зразумелыя, якія наступным чынам умее ўвекавечыць у спляценнях мастацкай тканіны". Апрача класічнага габелену цікавяць яго таксама тэхнікі кіліму. У сваіх кілімавых тканінах спалучае разнародныя ўплывы і набіраюць яны ў яго індывідуальнага, сучаснага кшталту.

Ягор Хлябіч на прэзентацыі сваіх прац „Усходнія кліматы ў мастацкай тканіне" 27 сакавіка г.г. у галерэі „Сподкі" Ваяводскага асяродка анімацыі культуры ў Беластоку паказаў спакойныя, тонкія ў колеры і дысцыплінаваныя кампазіцыі — краявіды тутэйшыя і з Блізкага Усходу, узоры выкліканыя ўсходнімі кліматамі.

— Гэта праца, — сціпла сказаў мастак, — пры якой, вядома, патрэбная апрача дысцыпліны, нейкая доля таленту. Над адным кілімам прыходзіцца пасядзець з паўгода. Штодзень працую па больш чым дзесяць гадзін. А з апошняй паездкі ў Беласток вязу ў Вроцлаў добрае ваўнянае прадзіва.

Выставу Ягора Хлябіча наведала таксама безліч Хлябічаў — родных і няродных аднафамільцаў аўтара, сярод іх і наступныя маладыя пакаленні. Дарэчы, у Ягора ёсць чатырох братоў і дзве сястры. З валілаўскага староння пайшлі з іх радні ў свет медыкі, педагогі, людзі мастацтва. Гарой Валілы! Прыслаў прывітанні Ягору з далёкага Мілана цяпер там прабываючы іншы валілаўскі мастак — Лявон Тарасэвіч. Прыгадвалі і іншага аўтара з суседняй Случанкі — Ігната Карповіча.

— Спрыяе, мабыць, дух месца, таму, каб выяўлялася ў нас мастацтва, — меркаваў Ягор Хлябіч. — Паэтычны наш народ беларускі, лірычны...

Ягор Хлябіч — мастак працавіты. Сведчаць аб тым больш за трыццаць выставак, у якіх прымаў удзел, таксама і персанальных — м.інш. у Этнаграфічным музеі Аддзеле Нацыянальнага музея ў Вроцлаве, у Ткацкай галерэі на Ятках у Вроцлаве, Сленжанскім музеі на Саботцы. З дакладна і з фантазіяй выкананых тканін б'е таксама ўнутраная цеплыня гэтага незвычайнага, уражлівага чалавека, які столькі часу прысвячае працягу і культываванню традыцыі сваёй малой айчыны.

Журобічы

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

У Журобічы цягнула мяне цікавасць да пазначанай на тапаграфічных картах царквы. Хаця вёска адступіла на кіламетр ва ўсходнім напрамку ад шашы з Бельска ў Сямятычы, якая лічыцца ўмоўнай мяжой паміж тутэйшымі „ўсходам" і „захадам", падазравалася мне, што царква стаіць сірацінкай, што асталася яна без вернікаў у выніку пасляваенных міграцый выкліканых націскамі з найвышэйшых і найніжэйшых сілавых узроўняў з мэтай „вырашання нацыянальных пытанняў".

Ідучы па вёсцы разглядаўся я, адкуль можна было б пачаць разведку мясцовай рэчаіснасці. Бо ж выбраўся я ў Журобічы спецыяльна ў сонечнае надвор'е, калі б старэйшыя вяскоўцы павыходзілі на вуліцу, каб можна было завязаць з імі гутарку. Але вуліца пуставала, вяскоўцы ёю не цікавіліся. Але даходзячы да царквы пабачыў я дымок ад цвінтара... Значыць, трапіў я лепш чым мог сабе ўявіць — размоўцы будуць побач царквы.

Цвінтар прыбіралі дзве жанчыны, заграбаючы ігліцу і там адразу спальваючы яе каля свежанькіх, яшчэ пахучых духмянай смалой сасновых пянькоў. Тыя сосны пассякалі некалькі дзён раней, бо яны ўжо трацілі сілы і маглі стаць пагрозай і царкве, і людзям. Жанчыны паінфармавалі мяне, што ў Журобічах пражывае сем праваслаўных сем'яў і ў іхнюю царкву раз у месяц прыязджае служыць набажэнства бацюшка з Жэрчыч. Паколькі яны былі заняты працай, параілі мне пабачыць аддаленую каля кіламетра на поўнач ад Журобіч крыніцу, што ў даліне мясцовай рэчкі Лясной, якая далей уліваецца ў Нурэц.

Крыніцу мясцовыя вернікі аднавілі 29 ліпеня 2007 года. А была яна там з даўняга часу, бо ў тым месцы, паводле мясцовай легенды, на вольсе паявілася выява Багародзіцы. І тую выяву ў выглядзе Руднянскай Маці Божай ушаноўваюць у Журобічах. Толькі вось клопат, бо Руднянская выява з'яўляецца рарытэтам, да якога не ўдалося журобіцкім вернікам знайсці нават акафіста.

Расійскія інтэрнэтавыя рэсурсы паведамляюць, што Руднянская выява Багародзіцы з'явілася 12 кастрычніка 1687 года ў вёсцы Рудня ў Магілёўскай епархіі; ікона з гэтай выявай трапіла 25 гадоў пазней у Фролаўскі манастыр у Кіеве. На іконе Багародзіца трымае Дзіцятка ў левай руцэ, правай блаславляючы Яго; Маці і Сын у каронах.

Якім чынам ідэя Руднянскай іконы завітала ў Журобічы, мне няясна. Магчыма, што яна трапіла сюды з усходу. Аднак, паколькі паявілася яна на ўсходзе даволі позна, у мяне затлела думка, што яна можа быць мясцовага выраду, што яна з'явілася ў Журобічах раней. Праўда, такое меркаванне можа ў нашых мужыкоў паказацца нават ерассю, бо ж людзі ў нас прывыклі да мужыцтва, да таго, што ўсё паходзіць ад нейкіх паноў, а нават ад цароў — найлепш, каб усё было з Масквы...

Сваё меркаванне грунтую на тым, што крыніца, побач якой мела паказацца цудоўная выява, знаходзіцца на рудным месцы. Праўда, цяпер няма там руднай ракі, толькі змеліяраваны ручаёк, але ж калісь там такое месца магло быць. Магла быць тут напісана і падпісана ікона, якая ў неспакойным на нашых землях XVII стагоддзі магла рассыпаць ідэйныя ашчэпкі і ў іншыя месцы. Афіцыйная вэб-старонка Жэрчыцкага прыхода паведамляе, што Руднянская ікона знаходзіцца ў Журобічах „od najdawniejszych czasów". Там жа і звестка, што царква ў Журобічах была ўжо ў XVI стагоддзі, а ў 1662 годзе яе спонсарам была маскоўская княгіня Алена. У тую эпоху крыху людзей перабралася на ўсход, напрыклад, у 1664 годзе Сімяон Полацкі апынуўся ў Маскве; магчыма, што паралельна з ім перасяліўся і руднянскі іканапісец... Мог быць тады і нейкі акафіст, але шматлікія гарачыя падзеі, якія пракаціліся праз нашу зямельку, маглі спапяліць не толькі яго, але і памяць аб ім...

Адноўлены помнік на крыніцы

Летам мінулага года на згаданай крыніцы быў абноўлены цэментны крыж, пастаўлены ў 1912 годзе журобіцкімі жанчынамі, а на месца старых надпісаў былі прычэплены новыя таблічкі; нават дзе-нідзе выглядаюць з-пад іх тыя старыя надпісы. Крынічку накрылі новым дашком, вакол паставілі новую металічную агароджу. І ліпеньскую гадавіну вернікі хочуць адзначаць штогоду. Праўда, на Вадохрышча адтуль вады ўжо не бяруць, бо вернікаў замала, каб на крыніцу падацца з хрэсным ходам. Пастаянна на набажэнствы ў журобіцкую царкву прыходзіць да васьмі чалавек, але ва ўрачысты дзень царква запоўнілася.

Журобіцкія могілкі знаходзяцца недалёка ад царквы. Незвычайныя гэта могілкі, бо тут новых помнікаў мала і яны не засланілі старых, сярод якіх захавалася шмат яшчэ з царскага часу. Выдатна захаваныя і помнікі з міжваеннага перыяду, не толькі каменныя ці цэментныя, але і драўляныя. У цяперашні, спрыяльны для ўшанавання даўніны час невялікая журобіцкая некраполія магла б быць занесена ў спісак каштоўнасцей. Бо ж там, сярод старых помнікаў, у адсутнасць сённяшняй паўсюднай гонкі, час праходзіць няспешна, спрыяючы задуменню не толькі над мінулым, але і асэнсаванню таго, што *ныне и присно*. І яшчэ адзін рарытэт: дамінуючым на журобіцкіх могілках алфавітам астаецца спадчына славянскіх першанастаўнікаў.

Адной з жанчын, якая парадкавала цвінтар, была Марыя Гуц. Яна выконвае ролю старасты ў журобіцкай царкве, а калі ў час набажэнстваў адсутнічае матушка, заступае і псаломшчыка, і царкоўны хор. На гэтую ролю — захавальніка праваслаўя ў Журобічах, наканавала яе жыццё... Паўстагоддзя таму адзін з журобіцкіх праваслаўных кавалераў стаў хадзіць за каталіцкай дзяўчынай. А ягоны дзядзька, каб загарадзіць яму дарогу ў неафіцкі бок, завёз яго ў сваты ў Наройкі, да спадарыні Марыі. І яна з таго часу выконвае місію захавальніка праваслаўя не толькі для сваёй сям'і, але і для цэлай журобіцкай грамадкі. У прыватнасці спадарыня Марыя з'яўляецца сястрой Юліі Перавой, якая дала свае ўспаміны ў ніўскія мемуарныя выданні „У новай айчыне", „Пакаленне вайны" ды „Час трывогі і надзеі".

У Журобічах ёсць і каталіцкі дом малітвы, у які раз у тыдзень прыязджае ксёндз з Дзядковіч. Гэта невялічкая драўляная хатка, пастаўленая ў цэнтры вёскі пры самай вуліцы. І журобіцкія каталікі моляцца толькі тут, у сваёй кампаніі; у парафіяльны касцёл у Дзядковічы ім няспешна. Да таго ж Журобічы падмывае хваля новага часу, калі рэлігійнасць ідзе на спад — адносіцца гэта да абедзвюх канфесій. Перад адной з мураванак стаіць каплічка з фігуркай Езуса, агароджу да якой мірна раскідае час...

Можа гэты ўхіл ад духовага ў матэрыяльны бок вызначыла Бельгія, якая прывабіла шмат працавітых людзей з наваколля Сямятыч, у тым ліку і з Журобіч. І зароблеиыя на Захадзе грошы людзі прывозяць на сваю малую радзіму. Амаль усе мураванкі ў Журобічах пастаўлены за франкі і еўра. І далей некаторыя людзі бачаць тут сваю будучыню. Бо вёска яшчэ жыве — працуе тут крама, працуе пункт прыёму малака. Траіх гаспадароў мае свае малочныя студзільнікі, ад бельска-сямятыцкай шашы відаць вялікі куратнік побач вёскі... Школьны пляц пусты, бо будынак старой школы трэба было знесці з прычыны старасці, а дзяцей перавесці ў гмінную школу ў Дзядковічы; астаўся толькі запушчаны будынак, у якім калісь кватараваліся настаўнікі, а пазней працавала чатырохгодка. Аднак побач высіцца „Dom Rolnika", які выконвае ролю вясковага культурнага цэнтра. Дзейнічае тут вакальны калектыў „Kalina", тут і дэпо пажарнай каманды з тушыльнай машынай. Нядаўна, на ваяводскіх спаборніцтвах у Высокамазавецку журобіцкая каманда заняла другое месца.

Пра гэта я даведаўся ад спадарыні Гуц, якую пашчасціла мне сустрэць каля царквы. Пашчасціла, бо цяпер старажылы ў Журобічах на вуліцу не выходзяць. Выходзілі калісь, калі былі лаўкі перад хатамі. А цяпер лавак уздоўж вуліцы ў Журобічах няма — бо няма часу на іх сядзець калі ва ўсіх хатах тэлевізары.

90-я ўгодкі БНР у Познані

Познаньскія беларусы ўрачыста адсвяткавалі 90-я ўгодкі БНР. З гэтай нагоды адбылася лекцыя па гісторыі Беларускай Народнай Рэспублікі.

Беларусы ў Познані пішуць агульнанацыянальную дыктоўку.

Прачытаў яе доктар Марэк Фігура, выкладчык Усходняга інстытута. Пасля гэтага адбылася прэм'ера фільма „Беларускі Рэзыстанс". Беларусы Познані напісалі таксама агульнанацыянальную дыктоўку, якую прачытаў Віталь Воранаў — старшыня Беларускага культурна-асветніцкага цэнтра. На прэзентацыі быў прысутны пісьменнік і публіцыст Анатоль Маўчун, беларускія студэнты і прадстаўнікі Універсітэта імя Адама Міцкевіча.

Беларускі культурна-асветніцкі цэнтр у Познані

Гайнаўка

Запрашэнне на рэйд

Асяродак спроту і адпачынку ў Гайнаўцы запрашае 12 красавіка г.г. на веласіпедны рэйд „Зберагчы здаровы розум". Адбудзецца ён на шляху Гайнаўка — Тапіла — Гайнаўка. Зборны пункт усіх ахвотных пры Гарадской управе па вул. А. Зіна а гадзіне 10. У праграме таксама вогнішча, бігас і кілбаскі, розныя гульні ды сустрэча з пагранічнікамі з Дубіч-Царкоўных. За дэталёвай інфармацыяй можна звяртацца ў асяродак па тэлефоне н-р 085 682276.

(ян)

Віня Пых у Познані

5 сакавіка б.г. у адной з познаньскіх кнігарняў Віталь Воранаў прэзентаваў сваю кнігу „Віня Пых". Зацікаўленых было многа — моладзь, студэнты, клерыкі, сябры Віталя, а і пажылыя асобы таксама. Быў таксама і госць з Беларусі, Станіслаў Шушкевіч. Вядома, не абышлося без тэлебачання і тых, што рабілі здымкі.

Пытанні перакладчыку (а заадно і выдаўцу) ставіліся розныя, напрыклад, чаму кніжка друкавалася ў Познані. Віталь не скрываў свае радасці, што якраз тут яна была выдадзенай, а нават адказваючы на пытанні пажартаваў: „У Познані ж некалі — а было гэта крыху больш за 500 гадоў таму — судзілі беларускага першадрукара Францыска Скарыну. Ягоныя абвінавачванні і апраўданне запісаныя тут у судовых актах гусіным пяром..." Насамрэч аказалася, што тут найменш было праблемаў з выданнем чым, скажам, у Беларусі... Гаварыў ён і пра намер рэкамендаваць кнігу ў краінах, дзе сёння жывуць многія беларусы, напрыклад, у Маскве, у Канадзе, у ЗША...

Анатоль МАЎЧУН

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Ларыса Геніюш на Свяце Волі

Мы прывыклі, што на святкаванні 25 Сакавіка пабачым вядомых і прызнаных бардаў, дэкламатараў ці рок-гурты. Мы ведаем, што выступяць яны з патрыятычнымі вершамі, песнямі, пастаноўкамі. Гэта прыгожая традыцыя. Аднак найбольшае ўражанне пакідаюць свежыя і новыя праекты. Вядома, калі яны займальныя, жывыя і дапрацаваныя...

Такія словы захаплення можна выказаць у адрас дзяўчат і хлопцаў з беластоцкай „чацвёркі" і іх настаўніцы Аліны Ваўранюк. У іх выкананні мы пабачылі паэтычна-музычны мантаж на словы Ларысы Геніюш і музыку Яна Тарасевіча.

— Чаму мы рашыліся падрыхтаваць якраз вершы Ларысы Геніюш? Таму, што запамяталася выступленне Ліды Пякарскай у конкурсе „Роднае слова". Яна дэкламавала верш „Дзед". Нам хацелася пачуць гэты верш яшчэ раз на сцэне, — успамінае настаўніца.

У тым, як чароўныя і заадно складаныя вершы Ларысы Геніюш пераканаліся ўсе ўдзельнікі сёлетняга прадметнага конкурсу для гімназістаў. Трэба многа інтэлектуальнага высілку, каб патрапіць у сэнс зместу. Трэба многа ўяўлення, каб адчуць мелодыю і красу радкоў. І многа ўражлівасці, каб крануць моц сказанага.

Усе гэтыя творчыя пакуты спазналі беластоцкія дэкламатары:

— Спачатку мы напалохаліся, думалі, што пастаноўка не атрымаецца, — успамінае настаўніца, — аднак з часам вершы пачалі адкрывацца, набылі гучанне.

У падборцы апынуліся фрагменты каля 20 вершаў з усіх перыядаў творчасці паэткі. І хоць вершы былі даволі складаныя, дэкламатары патрапілі ўразіць публіку, якая не шкадавала ім воплескаў. Нашых сяброў пахваліў нават парламентарый Роберт Тышкевіч:

— Калі я пачуў вашае выступленне, ведаю, што Беларусь не загіне!

Прэзентацыю ўзбагаціў мультымедыйны паказ здымкаў з жыцця і творчасці Ларысы Геніюш. Тут варта адзначыць, што сярод публікі быў прысутны ўнук паэткі, спадар Міхась. У час паказу мы маглі пабачыць казачныя лісты, якія паэтка пісала ўнукам. Усе пісьмы аздабляла яна малюнкамі звяркоў. Ці прадчувала ўжо тады, што яе нашчадак у будучыні стане ветэрынарам і будзе дапамагаць нашым чатырохногім сябрам?!

Вядома, у падборцы пераважна гучалі вершы пра любоў і адданасць Беларусі. На тое ж святкуем Дзень Волі!

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Дэкламатары з „чацвёркі"

Ліст Ларысы Геніюш унукам Міхасю і Алесю

Міхась Геніюш на святкаванні

Міра ЛУКША

Вароны ў Варанянах

Прыляцелі вароны ў Вараняны.
Здалёк яны ляцелі, ды так рана! —
З самага Варонежа сюды нясло
Варон кузінаў чорнае крыло.
А каб лягчэй варонам, наўздагон
Дзьмуў вецер моцны ў хвасты варон.
І рады госцям усе вароны ў Варанянах,
Адно недаспадобы, што так рана
Варонежскія сваячкі прыляцелі,
Бо гасціны адпаведнай не паспелі
Вароны з Варанян зрабіць як след.
У пачастунак — учарашні хлеб?
Ды кожны жыхар Варанянаў,
Устаўшы ў нядзельку рана,
Замежным госцям нясе пачастунак,
Паклаўшы хто ў кошык, хто ў клунак
Крупы, насенне, бульбу ды кілбасы... —
Усё, што ў варанянцаў ёсць у прыпасах.
Каб усім Варанянам не быў сорам
Прыняць замежніц. І спяваюць хорам
І варанянцы, і вароны прывітанне:
„Хай нам усім вясёлы дзень настане!"

Казачны падарунак з Мінска

У велікодны перыяд абдароўваем дзяцей валачобным. Дорым ім фарбаваныя яйкі, ласункі, цацкі. Добра ў якасці падарунка прыдбаць беларускую кніжку або кампакт-дыск з беларускімі казкамі або песнямі.

Нядаўна мы атрымалі „казачны" падарунак ад генеральнага консула Рэспублікі Беларусь у Беластоку Міхала Аляксейчыка — серыю сямі кампакт-дыскаў з беларускімі казкамі. Тры першыя запісы гэта казкі пра жывёл, апошнія — чарадзейныя казкі. Чытаюць іх прафесійныя лектары Алег Хаменка і Ларыса Рыжкова. У калекцыі 60 народных казак. Большасць гэта добра вядомыя творы, такія як „Казка пра старога Ката", „Сабака і Воўк", „Сынок-з-кулачок". „З рога ўсяго многа", „Як ведзьма сына жаніла". Тое, што ўражвае ў праекце, гэта адвага! Складальнікі не пабаяліся памясціць у саставе казак з жорсткім зместам, такіх як „Каза Дарота". Для сучаснага

дзіцяці можа паказацца незразумелым, калі за правіну, якой тут звычайная мана, „дзед зарэзаў дачок і сваю жонку". Справа ў тым, што ў адукацыйным творы, якім з'яўляецца казка, патрэбны элементы страху. Пра гэта памяталі класікі казкі: Ханс Крысціян Андэрсен, Шарль Пэро ці браты Грым. Беларускія казкі — асаблівыя; у іх вельмі цесна пераплятаецца свет людзей, жывёл, раслін. Часам гучаць яны як чыстая фантастыка!

Чаму варта чытаць дзецям казкі? Разам з мовай яны пазнаюць іх каларыт і старую народную праўду. Вядома, запіс на кампакт-дыску — гэта дадатковая выгада. Можна іх слухаць у цёмным пакоі, галаву схаваўшы пад коўдру, або едучы з бацькамі ў машыне.

Нашым чытачам прапануем конкурс. Вам трэба адказаць на адно казачнае пытанне: **Які звер у беларускіх казках самы дурны?**

а) ліса,
б) воўк,
в) цмок

Сярод аўтараў правільных адказаў разыграем узнагароды — кампакт-дыскі з беларускімі казкамі. Адказы дасылайце да канца красавіка.

ЗОРКА

Вершы Віктара Шведа

Таўстун

Бацька стаіць пад школай,
На просьбу жонкі і маткі.
Чакае сыночка Міколу,
Які канчае заняткі.

— Чакае пан, бачу, дзіцяці? -
Настаўнік стрэў постаць-калоду.
— Не, я павінен прызнацца,
Што тоўсты такі заўсёды.

Найстарэйшы інструмент

На ўроку музыкі настаўнік
Пытае: — Дарагія дзеці,
Які інструмент цікаўны
Найстарэйшы на свеце?

— Я думаю, акардэон, —
Сцвярджае вучань Жэня. —
Гэта таму, што цэлы ён
Паморшчаны страшэнна.

ГІСТОРЫЯ ПРА ТОЕ, ЧЫМ МОЖНА ЗАМЯНІЦЬ АРАНЖЫКІ, КАЛІ ІХ БРАКУЕ

... Як хацелася Петрыку зрабіць для Верачкі што-небудзь незвычайнае! Такое, каб пабачыла, і адразу растала, здзівілася, закахалася ў яго яшчэ болей!

Перабраў у галаве тысячы розных спосабаў. І ўсе — рашуча адрынуў. Усё было не тое, не такое, як хацелася. І раптам... Трапілася яму на вочы кніга, у якой галоўны герой выклаў для сваёй каханай усю падлогу аранжыкамі. Ну, можа, і не трапілася, а ваш дзядзечка падклаў яе куды трэба, але тое ўжо неістотна.

О, гэта Петрыку спадабалася! Запрасіць Верачку да сябе дахаты, у свой пакойчык; і паўсюль — дзе ступіць нага — гэтыя сонечныя, водарныя, яркія мячыкі. Хлапчук адразу ўявіў, якога колеру, якой велічыні будуць у дзяўчыны вочы, — і ягонае сэрца кранула найцяплейшая хваля...

Толькі імгненнем пазней вочы крануў адчаёвы сум. Каб столькі аранжыкаў... ды на ўсю падлогу!.. — на жаль, на вялікі жаль, столькі грошай Петрык не мае. Узняў ён свае вочы ў веснавое акно і... шырока, па-добраму заўсміхаўся.

А калі Верачка адгукнулася на запрашэнне хлопца і ціха, аднак адначасна рашуча, зайшла ў ягоны пакой — ейныя вочы і насамрэч сталі шырокімі, іскрыстымі, мілымі. Таму што — яна адразу заўважыла.

— Божа, колькі сонечных зайчыкаў! Дзе ты іх столькі сабраў?! — запытала ўсхвалявана.

— Яны ўсе твае, — і Петрык падхапіў аднаго, самага яркага і гарэзнага, ды працягнуў дзяўчыне.

— Цяжка было?

— Што? — не адразу зразумеў Петрык.

— Сабраць.

Хлапчына зноў уважліва зазірнуў у глыбокія вочы дзяўчыны:

— Хіба можа быць цяжкім тое, што робіцца для цябе? Для адной толькі цябе. І толькі...

І раптам усе без выключэння сонечныя зайчыкі пераскочылі з цёплай і невыносна бліскучай падлогі ў неадрыўныя вочы юнака і дзяўчыны. Пераскочылі і... засталіся, прапалі там назаўсёды.

Бачылі сёння ў ранішнім парку хто праходзіў вас міма? Вы іх пазналі? Ну вядома, пазналі. Паколькі іх пасля той сустрэчы, пасля таго сонечнага спаткання, не пазнаць ужо немагчыма.

Ваш Дзядзечка Сід
18 сакавіка 2008 г., Кобрын

Музыка з кайфам

„Бонда" — важны кавалак цэласці

Слоўнікі тлумачаць, што „бонда" гэта бохан хлеба ці круг каўбасы. Іншыя кажуць, што гэта і луста хлеба, і кусок зямлі. Гурт „Бонда" ў гісторыі беларускай музыкі гэта таксама кавалак пэўнай цэласці, якая дала адвагу беларускім музыкам ствараць новыя праекты, а — самае галоўнае — на нашай роднай беларускай мове. Мабыць, доказам гэтай адвагі з'яўляецца і тое, з чым асацыюецца назва гурту. Мне перш за ўсё з бандай, якая пачала маленькую рэвалюцыю ў музыцы, пагражаючы пальцам тым, якія ў творчасці абмяжоўвалі магчымасці карыстання беларускай мовай.

Мая першая свядомая сустрэча з творчасцю „Бонды" адбылася недзе ў 1998 годзе. Тады ўпершыню супольна з калектывам Гайнаўскага белліцэя „Знічка" заспявалі мы, можна сказаць, кавер на песню „Стэфка". З гэтага моманту стала яна мне амаль культавай. Чаму так? А вось таму, што я, маладая дзеўка, спявала легендарную беларускую песню гурту, які пачынаў беларускамоўную плынь у савецкай эстраднай культуры. Гурт заснаваны быў у 1985 годзе, калі мне было толькі тры гады. Ажно не верыцца, што вакаліст „Бонды" Ігар Варашкевіч спявае да сённяшняга дня, а адзін з яе гітарыстаў, Слава Корань, сёння надалей іграе і спявае ва „Улісе".

За год сваёй працы „Бонда" запісала альбом „Месца пад сонцам", як казалі, інспіраваны польскай музыкай, перш за ўсё гурту „Lady Pank". Калі аднак слухаем запісаў, тады аказваецца, што гурт стварыў уласны стыль і стаў крыніцай цудоўных песень, якія, дарэчы, да сёння выконваюцца на канцэртах „Крамай". Голас Варашкевіча не памяняўся, а напэўна яго гучанне. Не ўяўляю сабе аднак беларускай музыкі без такіх кампазіцый як „Слуцкая брама", а ў мінулым годзе да беларускай рок-кароны прэтэндавала нават новая песня „Крамы", інспіраваная бондаўскай „Стэфкай" пад загалоўкам „Стэфка 20 год пазней". „Бонда" таксама вядомая як гурт, на песні якога ствараліся першыя кліпы („Ура", „Койданава").

Хаця дзейнасць гурту спынілася ў 1989 годзе, то мы ўсе, закаханыя ў беларускім року, удзячны за тое, што „Бонда" дала пачатак „Краме"і „Улісу", нарадзіла „Рокіс" ды „Little Blues Band". Ці гэта адно з уяўленняў Маці-Беларусь..?:)

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 15

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 11: Кветачка, мак, век, далягляд, міс, уласнік, карта, ар. Сук, Клад, камар, ліст, вясна, Алег, клік, адрас.

Узнагароды, кніжку **А. А. Мілна „Віня Пых"** („Kubuś Puchatek" па-беларуску), выйгралі: **Паўліна Паплаўская** з Бельска-Падляшскага, **Агнешка Мароз** з Гайнаўкі, **Агата Паніквіцкая, Каміля Бароўская** з Бабік, **Якуб Андрацкі** з Саколкі, **Карына Гіншт, Марта Адамюк** з Чыжоў. Віншуем!



Вяселле з песняй

Ужо мінула больш за 30 гадоў, калі прыйшлося мне быць у заходняй частцы Падляшскага ваяводства — у Высокамазавецкім павеце. Пры ад'ездзе мы дамовіліся, што на простай гаворцы размаўляць не будзем.

Малады быў праваслаўнага веравызнання, а маладая — каталіцкага. У касцёле яны не вянчаліся, бо сям'я маладога мела высокія пасады, а маладуха працавала ў міліцыі. На вяселле запрасілі ўсю павятовую „смятанку". Быў сакратар ПАРП, прэзас ЗСЛ ды павятовы камендант міліцыі. Маладым на вызначаны час падставілі легкавушкі, так што ўсе запрошаныя госці маглі паехаць у ЗАГС, падзівіцца на маладых і павіншаваць. Я не паехаў.

Калі маладая пара вярнулася з ЗАГСа і ўсе ўсадавіліся за багата застаўленымі гарэлкай і закуссю сталамі, мне давялося сядзець напроціў сакратара ПАРП з жонкай і невялічкай дачушкай, што сядзела паміж бацькамі. У кутку каля патэфона сеў малады, а калі ўжо ўсе дабравата пахмяліліся, завёў ён яго і стаў пускаць кружэлкі з рускімі песнямі. Дачушка сакратара сказала бацьку: „Tatusiu, to ta piosenka, co ty jej nie lubisz". Сакратар ціха адказаў малой: „Cicho, tu jest dużo takich!" Дзяўчынка змоўкла і больш нічога не гаварыла. Нас было там, апрача бацькоў маладога, чатыры пары.

Было гэта летам і калі мы выйшлі закурыць папяросу, я спытаўся ў маладога, адкуль ён сам родам і чаму яму падабаюцца рускія песні. Хлопец адказаў мне на чыстай беларускай мове, што родам ён з Міклашэва з-пад Белавежскай пушчы. Ягоныя бацькі былі вывезены ў час нямецкай акупацыі і жылі ў вёсцы Трасцянка Нарваўскай гміны, а ён нават стаў хросным бацькам дачкі Васіля Петручука з Трасцянкі. У Высокім-Мазавецкім ён працуе шафёрам павятовага каменданта міліцыі і ніколі не забывае свайго беларускага паходжання. Вяселле працягвалася ўсю ноч, а на другі дзень у панядзелак быў яшчэ паправунак.

Калі ў маладой пары нарадзіўся сын, дык яго тайком ахрысцілі ў касцёле. Цяпер іх сям'я з'яўляецца каталіцкай. Сын ажаніўся, бацькі ўжо на пенсіі і жывуць усе ў згодзе. Сваіх бацькоў і дзядоў прывезлі пахаваць на могілкі ў Трасцянку, у іх родную парафію. Хай ім зямля будзе пухам!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Сям'і Гарадэцкіх
і Назарэвічаў
з прычыны
напаткаўшага іх гора

— смерці Маці і Жонкі
Галены Назарэвіч

— сардэчныя словы
спачування ад
Міхала Мінцэвіча
і суседзяў.

Успамін ляснічага Кубінкевіча

Пётр БАЙКО

У ліку наведваючых Белавежу турыстаў час да часу спатыкаюцца асобы, якія нейкі час тут жылі і працавалі. Раскінулі іх па краіне, а нярэдка і па свеце гістарычныя завірухі. Наведваючы сваю даўнюю мясцовасць, яны ахвотна вяртаюцца ўспамінамі ў мінулае, да здарэнняў і людзей. У 1998 годзе мне было прыемна пазнаёміцца з пакойным ужо (памёр 30 кастрычніка 1999 года) адстаўным ляснічым Рышардам Кубінкевічам з Маломіцаў тадышняга Зялёнагурскага, а цяпер Любушскага ваяводства.

Удзельнікі першых курсаў ляснічых на памятным здымку, выкананым у маі 1946 года на ступеньках у даўняе казіно, што ў Палацавым парку ў Белавежы. Публікуецца ўпершыню

Рышард Кубінкевіч нарадзіўся 11 сакавіка 1926 года ў Лебедзеве (зараз у Беларусі). У Белавежу прыехаў з бацькамі на пачатку трыццатых гадоў з Брэста. Бацька працаваў у Дырэкцыі дзяржаўных лясоў (ДДЛ). Жылі пачаткова ў арандаванай кватэры на Стачку, затым у Дырэкцыйным парку. Пачатковую школу Рышард Кубінкевіч закончыў у Белавежы. Пасля шостага класа здаў экзамен у гімназію ў Брэсце. На жаль, пачатак II сусветнай вайны затрымаў яго ў Белавежы. Тут працягваў навуку ў школе, якую саветы адкрылі ў будынку даваеннай бурсы, што знаходзілася ў Дырэкцыйным парку. Калі прыйшлі немцы, распачаліся вывазкі на прымусовыя работы. Бурсу прызначылі на казарму. Бацька Рышарда Кубінкевіча і двух іншых былых працаўнікоў ДДЛ уладкаваліся на працу ў кацельні качагарамі. Яны хутка ўцягнулі да гэтай працы таксама Рышарда, які такім спосабам пазбегнуў вывазкі ва Усходнюю Прусію.

— Пачаткова дрэва на апал падрыхтоўвалі яўрэі, — успамінаў ляснічы, — а калі іх не хапіла, тады савецкія ваеннапалонныя. — Немцы з раз'юшанасцю знішчалі рэшткі польскасці і ўводзілі нечуваны тэрор. Бібліятэка „Сям'і лесніка", якая заставалася ў Дырэкцыйным парку, рускім неяк не перашкаджала, але немцы выцягнулі ўвесь бібліятэчны збор перад будынак і кніжкі падпалілі. Калі я падышоў да палымнеючага кастра, нікога паблізу не было. Пачаў я выцягваць тыя кніжкі, да якіх агонь яшчэ не дакрануўся. Дзве паклаў за пазуху, іншыя складваў на руцэ. Раптам з'явіўся немец і загадаў мне ўкінуць усё назад у агонь. Гэтак я і зрабіў. Пры нагодзе атрымаў моцны выспятак, а на вокліч „раўс!" даў драла.

Усю ваенную завіруху Рышард Кубінкевіч правёў у Белавежы. Быў сведкам многіх здарэнняў. А вось гэтак успамінаў ён вызваленне з-пад акупацыі:

— Прагнаць немцаў з Белавежы не было лёгкай задачай. Наступленне савецкіх войск развівалася з боку Броўска. Акупанты выслалі супраць іх два танкі. Аднаго паразілі снарадам на Броўскай дарозе, непадалёку месца расстрэлу і пахавання 222 асоб у жніўні і снежні 1942 года. Другі танк, адступаючы, моцна абстрэльваў пункты непрыяцеля.

— Што тычыцца спалення палаца, то лічу, што можна было яго выратаваць. Уласаўцы (у сапраўднасці — салдаты з венгерскага атрада, які змагаўся на баку немцаў — П. Б.) пад нямецкім камандаваннем, распалілі перад самым адыходам пажар у адным сутарэнні. Агонь доўга не вырываўся вонкі, але мне самому было не пад сілу патушыць яго, я не меў ніадкуль помачы.

Частка працаўнікоў Надляснічтва Белавежа ў другой палове 1940-х гадоў. Ззаду стаіць ляснічы Рышард Кубінкевіч. Па баках — кіраўнік смалакурні (злева) і сакратар надляснічтва. У белым світэры служачая Яноўская. Публікуецца ўпершыню

Пасля вайны Рышард Кубінкевіч быў слухачом лясных курсаў, якія далі падмурак будучаму Лясному тэхнікуму.

— Курсы праходзілі ў будынку даўняй царскай канюшні, што ў Палацавым парку, — успамінаў ляснічы. — У мяне захаваўся здымак групы курсантаў, зроблены ў маі 1946 года на ступеньках даваеннага казіно Дапрызыўной падрыхтоўкі леснікоў. Памятаю, што на першым курсе лекцыі чытаў вядомы яшчэ з даваеннага перыяду вучоны і заадно дырэктар Белавежскага нацыянальнага парку д-р Ян Ежы Карпінскі. Курсанты пасля экзаменаў размяркоўваліся Міністэрствам лясніцтва па паасобных акругах Дзяржаўных лясоў.

На працу ў Надляснічтва Белавежа Рышард Кубінкевіч стаў афіцыйна 1 сакавіка 1945 года, спачатку як практыкант, потым ляснічы. Працаваў да 16 ліпеня 1948 года. У гэтым перыядзе ўдзельнічаў м.інш. у высяканні паласы дзяржаўнай мяжы.

— Паласа была намечана на грунце восенню 1944 года пры дапамозе невялікіх капцоў і калочкаў. Польскую групу састаўлялі я і двух гаёвых. Адзін гаёвы называўся Антоні Домбэк, прозвішча другога, старэйшага, вылецела мне ўжо з памяці. Ведаю толькі, што жыў ён паблізу надляснічтва (магчыма Цесляк? — П. Б.). Паралельна з намі, на другім баку, працавала савецкая група. Рабіла яна тое ж, што і мы. Пачаткова давалі там працу мясцовым, але калі пачаліся ўцёкі на наш бок, заступілі іх азіяты, якія не ведалі рускай мовы. Азіяты ахоўвалі таксама мяжу, будучы вельмі густа на ёй расстаўленымі. Сцяну высечкі намецілі мы пры дапамозе тасьмы і тычак. За намі ішлі дрывасекі, якія ссякалі дрэвы і адрэзвалі галіны. Больш вартасныя калоды сцягвалі мы коньмі набытчыкаў, якія выкупілі гэты лесаматэрыял у надляснічтве. Астатнія дрэвы сцягвалі мы на абочыну паласы, дзе яны чакалі далейшай перапрацоўкі. Мая група працавала на адрэзку ад ракі Нараўкі да Броўскай дарогі, значыць, да запаведніка. Памятаю яшчэ выпадак, калі застрэлілі лася, які пераходзіў праз мяжу. Адрэзалі мы яму галаву з рагамі і перадалі ў Даследчы інстытут лясніцтва, якім кіраваў згаданы ўжо мною д-р Карпінскі. Кадры Надляснічтва Белавежа ў той перыяд, як сабе прыпамінаю, складалі м.інш: надляснічы Дыянізы Пшыкуцкі, намеснік надляснічага Стэфан Рычаноўскі, ляснічым Лясніцтва Белавежа быў я сам, а з боку Гайнаўкі (бадай Лясніцтва Батаруўка) — Казімеж Якімовіч.

Пасля выезду з Белавежы Рышард Кубінкевіч закончыў завочна тэхнікум і атрымаў атэстат сталасці. На працягу 26 гадоў працаваў ляснічым у акрузе Зялёна Гура. Пасля апошняй аўтакатастрофы (а ўдзельнічаў ён у чатырох аварыях) закончыў сваю прафесійную працу. Будучы на пенсіі, жыў з сям'ёй у сваім доме ў Маломіцах па вуліцы Касцельнай, 20 а.

У студзені 1999 года Рышард Кубінкевіч, праз маё пасрэдніцтва, перадаў на выстаўку ў Асяродак лясной адукацыі „Ягелонскае" дзве выратаваныя ім кніжкі з бібліятэкі „Сям'і лесніка" — тыя, якія схаваў за пазуху.

Тайны пятнаццаці трунаў, знойдзеных у замкавых падзямеллях

Вестка пра сенсацыйнае адкрыццё ў Давыд-Гарадку зноў прывяло нас на Палессе. У гэтую пару года перапоўненыя рэчкі. Балоты выцiснулі з сябе ваду, якая затапіла ўсю паверхню. Усё там залітае. Сам Давыд-Гарадок топіцца ў гразі. Ніхто не хоча паверыць, што будзем вяртацца дарогай. У такі час?! Хто такое бачыў! Плывіце лепш суднам да станцыі Прыпяць, або ўгару Гарынём да станцыі Гарынь. А найлепш будзе, як вы, паны, вернецеся ў Пінск. У балоце не адзін утапіўся.

Ноч. Конь і чалавек брыдуць па балоце. Дваццаць пяць кіламетраў туды і назад, разам 50 кіламетраў маруднай язды. Ідзе дождж. Калі пакропіць яшчэ дзень або два, не пойдзе ніякая падвода. Месячнае сяйво намагаецца прабіцца праз тоўстыя пласты хмараў. Перасякаем Смерць. Калі перапраўляемся ўброд цераз раку Смерць, трэба падымаць ногі, бо вада ўліваецца ў воз. Падымем угару валізкі! Шчасліва пераправіліся. З намі асталіся балоты і неба.

Услед мігаціць яшчэ святло — яно так далееёка! У такой прасторы яно зводзіць і нервуе. Ля Лахвы гараць ліхтары, відаць паром, які адсюль мо дзесяць вёрст. Такая бясконцая раўніна. Калі мы плылі паромам, абмінуў нас са свістам параход і падаўся ўніз Прыпяці. Месяц таксама выглянуў на адзін момант, быццам хацеў паказаць усю чароўнасць ракі, чаротаў, пушчы, балот. Цішыня тут амаль адчувальная. Калі цераз мост мы ўехалі ў лес, некалькі разоў вухкалі совы, адзіныя жывыя істоты, якія, як і мы, не спалі ў гэтую ноч. Аднак за лесам паказалася святло, недзе за гарызонтам быў ужо Давыд-Гарадок. Ад моманту, калі мы пабачылі бляск, ехалі яшчэ паўтары гадзіны!...

Горад топіцца ў гразі

У Давыд-Гарадку сітуацыя выглядае так: каля дамоў пакладзены высокія, у палову метра, драўляныя памосты, якія служаць як ходнікі. Сярэдзіна вуліцы напамінае рэчку гразі. Калі трэба перайсці на другі бок вуліцы, мусова знайсці такі „брод", дзе нага гразне толькі па костачкі. Звычайна гразне да палавіны лыткі. Усе местачкоўцы ходзяць у доўгіх ботах: мужчыны, кабеты і дзеці. Нездарма Давыд-Гарадок слаўны з-за дасканалых ботаў і процьмы шаўцоў.

Пасярэдзіне мястэчка стаіць мураваная царкоўка. Непадалёк новы касцёл. На касцёле свеціцца крыж, аздоблены электрычнымі лямпкамі, і напамінае віленскія рэкламы-неоны. Відаць яго здалёк. Царква не была горшай. І зараз два крыжы ўсю ноч гараць над горадам. А горад топіцца ў гразі.

Ляжалі ўсе галавой „на ўсход"

Замкавая гара знаходзіцца крыху збоку мястэчка. Ад незапамятных часоў там стаялі замкі давыдгарадоцкіх князёў. Калі гарэлі старыя, ставілі новыя. Цягнулася гэтак стагоддзямі. Калі ў заняпад прыйшло палітычна-стратэгічнае значэнне Давыд-Гарадка, разам заняпаў замак. На гары ўзвялі драўляную царкву. Сёлета ўспыхнуў вялікі пажар (пра гэта мы шырока пісалі), згарэла таксама царква. Са сродкаў, якія атрымалі ад страхоўкі (40 тысяч злотых) ды складчыны, на якія разлічваюць праваслаўныя духоўныя сферы, мяшчане рашылі адбудаваць новую царкву, мураваную, прыблізна за 150 тысяч злотых. 24 кастрычніка асвяцілі краевугольны камень і адбылася ўрачыстасць з удзелам яго праасвяшчэнства епіскапа праваслаўнага Аляксандра, духавенства, грамадства і ўлад. Былі прамовы, між іншым, у поспех Рэчы Паспалітай. Прысутнічаў староста і паны афіцэры Корпуса аховы пагранічча.

Антон Луцкевіч

Адначасова, некалькі метраў глыбей у асвечанай зямлі ляжалі князі і валадары, у туфлях з ласінай шкуркі, праўдападобна з XII стагоддзя. Забытыя ды незнаёмыя, усе галовамі павернутымі на ўсход...

Праз бэлькі і падлогі строга замчышча

Сталі капаць замлю пад фундаменты новай царквы, глыбокія фундаменты, чатыры-пяць метраў у глыб Замкавай гары. Наткнуліся на папярэчныя бэлькі. Некаторыя былі ўжо струхлелыя, гнілыя, іншыя свежыя, быццам паклалі іх сёння. Рубалі іх, пілавалі ўпоперак і капалі далей. Натрапілі на памост у выглядзе дубовага ходніка. Парубалі. Лапаты зрылі густую, тоўстую зямлю, насычаную гніллю, смуродам.

Выкапалі ласіныя рогі. Большыя рогі былі крыху струхлелыя. Меншыя — цалюткія. Выкапалі дзіўны прадмет: касцяны прастакутнік з жолабам выцертым рукой або шнурком. Ніхто не ведае для чаго ён служыў. Выкапалі аздобу з рэбравых касцей, з колцамі і дзіркамі па баках. Таксама касцяныя тронкі, якія выглядам напамінаюць ручку ад патэльні. Шмат шкарлупінаў, гліняныя гаршкі. Шматлікія дубовыя палі, добра захаваныя. Дзе-нідзе віднела белая бярозавая кара.

Першыя 13 трунаў

Раптам, неяк глуха рыдлёўкі ўдарылі ў дзерава. Далей — пустка. Зрылі зямлю. Перад вачыма сённяшніх гарадчукоў паказаліся трынаццаць дубовых трунаў, якія стаялі пад нізкім скляпеннем з дубовых дошак і паляў.

Зусім няслушна, на мой погляд, вырашыў благачынны Аляксандр Беляў, які загадаў перапахаваць труны ў другое месца, на ўзгорку, загадаў закапаць і паставіць крыж. Нам, нашчадкам, якія хочуць пазнаёміцца з гісторыяй краіны, трэба высветліць такую незвычайную, бясцэнную знаходку. А прахам князёў (гэта найбольш праўдападобная версія) належыцца больш годны спачын.

Куды мы трапілі

Калі раніцай мы зайшлі ў падзямельныя калідоры, выкапаныя для фундаментаў новай царквы, нашыя боты пагрузіліся ў балота, так як і ва ўсім Давыд-Гарадку. Калідор глыбінёй у 4-5 метраў, шырынёй да двух метраў, сапраўды ўяўляў сабой незвычайную карціну. Па двух баках, у кашталце пластыраў, сядзяць у зямлі канцы адпілаваных бэлек і дошак. Наслаенне гэтых пластоў сягае па старыя фундаменты драўлянай царквы, той, якая згарэла. Што тут было? Месцам відаць рэгулярную сцяну з бэлек, складзеную зрубам, побач, старчма ўкапаныя клёцы, якія падтрымоўвалі канструкцыю. Рэшткі падлогі, калодзеж абшыты дубовымі дошкамі. Дзе ні глянеш, процьма глінянай пасуды, якую дабываем пальцамі, проста са сцен зямнога калідора. Чуваць цяжкі, прагнілы гар.

Замкавая гара — самае высокае месца ў горадзе. Акаляюць яе рэшткі валоў. — Што тут было? — Тут пражывалі людзі, а тое, што асталося — гэта сляды іх побыту. Астаткі строга драўлянага замчышча.

Характэрная тут адна прымета: нідзе не пабачыш слядоў пажару, ні аднаго кавалка вугалю, ні адной абгарэлай бэлькі. Некаторыя бэлькі струхлелыя, палец уваходзіць у іх сярэдзіну, быццам у губку. Але вось з зямлі вырастае каласальны сасновы стоўп, ён не габляваны, адно пачышчаны з кары. Мабыць, раней падтрымваў скляпенне, ён такі цвёрды і свежы, быццам толькі ўчора яго закапалі.

Другім характэрным момантам з'яўляецца адсутнасць якіх-колечы прадметаў з металу. Ні работнікі, ні мы за цэлы дзень працы не знайшлі нічога, што паказвала б на такі прадмет ці яго металёвую частку. Затое знаходзілі мы цікавыя драўляныя гвазды, якія дабывалі з дошак.

Шукаем у трунах

Пан Антон Луцкевіч, адзін з найзнакамітшых віленскіх археолагаў, кажа:

— Давайце адкрыем труну, можа знойдзем там нейкія прадметы, нешта з арнаментыкі. Тады зможам вызначыць век, даведаемся з якой знаходкай у нас дачыненне.

Трынаццаць знойдзеных трунаў стаялі ў роўнай шарэнзе, у малых адлегласцях, усе нябожчыкі мелі твары павернутыя на ўсход. Усе дамавіны выкананы з дубовых дошак, іх таўшчыня 5-6 сантыметраў, яны знітаваныя ў форму прамавугольных скрыняў з дапамогай фугаў, без гваздоў. Зверху пакрытыя дубовай дошкай, не надта шчыльна.

— Ці знайшлі вы нешта ўсярэдзіне?

— Нічога, апрача шкілета.

— Нічога?

— Значыць, усе шкілеты былі абутыя ў ласіныя туфлі, пашытыя на адзін лад.

Туфлі з ласінай шкуркі

Работнікі яшчэ раз дабываюць труны што ўгары, мы знаходзімся ўнізе, дакранаемся да новых, не ткнутых яшчэ рукой сучаснага чалавека дамавін. Іх дзве: чатырнаццатая і пятнаццатая па ліку.

Рыдлёўкі стукаюць у накрыўку, у бакі, прыбіраюць зямлю. Работнікі працуюць без энтузіязму, не хочуць дакранацца сваімі пальцамі. У іх пануры від.

— Не дачакаеш ты царства нябеснага за гэтую работу.

— Што ж ты пакойнікам спакою не даеш?!

Нам трэба ведаць, хто яны, гэтыя „пакойнікі".

Асцярожна здымаем века труны. Палескі дуб, мясісты, цяжкі.

Чэрап. Косці. Няма больш нічога. Адзін чэрап малы. Магчыма належаў ён жанчыне. Другі, наадварот, вялізны. Няма аздобаў, ні аднае прылады, зброі, нічога не знайшлі.

Адны туфлі.

Туфлі, якія сустрэнем на старажытных ілюстрацыях, іх выгляд амаль не змяніўся з часоў ранняга сярэднявечча па шаснаццатае стагоддзе. Кароткія, скроеныя па костачкі, з вострымі наскамі, пашытыя дратвай з двух кавалкаў шкуркі. Мясцовы ветэрынар пацвердзіў: гэта ласіная шкура. Без падэшваў.

Сенсацыя

Жывыя людзі стаяць навокал і моўчкі глядзяць у адкрытую дамавіну. Калі мы да іх дабіраліся, адтуль далятаў востры, пранікнёны гар. Ён хутка знік. Калі пашырым шчыліну, газы развеюцца ў паветры. Асталіся косці. У гэтай труне доўга доследы вядзе пан Луцкевіч. Ён знайшоў рэшткі зрэбнага палатна. Засунуў назад накрыўку.

Усміхнуўся.

— Вы мяркуеце, што гэта чатырнаццатае стагоддзе? Я думаю што тут маем дачыненне з ранейшым стагоддзем. Дарэчы, у гэтым мы самі неўзабаве ўпэўнімся.

***Юзэф Мацкевіч, „Słowo", 1936, nr 305 (6 listopada)*, пераклад з польскай мовы Г. Кандрацюк**

Пад крылом Ефрасінні Полацкай

Тацяна КАСУХА

Рыга ведае гэтае найвялікшае свята беларусаў — Дзень 25 Сакавіка. Латвійскае таварыства беларускай культуры „Сьвітанак” адзначае яго з самага пачатку свайго існавання. І за дваццаць гадоў дзейнасці таварыства ніколі не парушыла традыцыю. Вось і сёлета зноў у чарговы раз „Сьвітанак” запрасіў рыжан на галоўнае беларускае свята.

www.svitanak.lv

„Сьвітанкаўцы” віншуюць з 80-гадовым юбілеем доктара гістарычных навук Ілгу Апінэ

25 сакавіка гаспадарамі будынка Асацыяцыі нацыяльна-культурных таварыстваў Латвіі сталі беларусы. Асацыяцыя гасцінна расчыніла свае дзверы перад удзельнікамі беларускай імпрэзы, якіх сабралася поўная Вялікая зала, нягледзячы на працоўны дзень.

Твары слынных дзяцей зямлі беларускай Кастуся Езавітава і Ларысы Геніюш, якія паглядалі з палотнаў беларускіх мастакоў — вось хто першымі вітаў гасцей беларускага свята. Гэта свой падарунак да юбілею падрыхтавалі беларускія мастакі, сябры творчай суполкі „Маю гонар”. Яны зладзілі выставу, прысвечаную 90-м угодкам абвяшчэння БНР.

І таму першыя словы ўдзячнасці ў адрас тых, чые прозвішчы навекі застануцца ў нашай памяці. У гэтай кагорце і прозвішча Кастуся Езавітава, змагара беларускага нацыянальна-дзяржаўнага Адраджэння, слыннага асветніка, лёс якога назаўсёды звязаны і з Беларуссю, і з Латвіяй.

Адзін з удзельнікаў абвяшчэння БНР, народны сакратар ваенных спраў у складзе першага нацыянальнага ўрада Беларусі Кастусь Езавітаў у 1919-1920 гг. служыў шэфам беларускай ваенна-дыпламатычнай місіі ў Латвіі і Эстоніі. Тое, што прыбалтыйскія дзяржавы, у тым ліку і Фінляндыя, першымі прызналі БНР — яго несумненная заслуга, ушанаваная пазней званнем генерала-маёра. Пасля змушанага адыходу ад палітыкі Езавітаў прыняў латвійскае грамадзянства і распачаў вялікую 23-гадовую культурна-асветніцкую дзейнасць сярод беларусаў Латвіі. Ён абудзіў дзесяткі талентаў, паклікаўшы на „светлы след” нацыянальнага самавыяўлення тысячы людзей.

І сёння, праз гады, Кастусь Езавітаў і яго паплечнікі разам з намі, тут, на латвійскай зямлі, святкавалі найвялікшае беларускае свята. І вельмі важна было ўсведамляць, што гэтую векапомную дату беларусы святкуюць ва ўсім свеце. Прывітальныя віншаванні ўдзельнікам свята зачытаў старшыня Аб’яднання беларусаў-мастакоў Балтыі „Маю гонар”, кавалер Ордэна Трох Зорак Латвіі, адзін з заснавальнікаў таварыства „Сьвітанак” Вячка Целеш. Ён агучыў і пасланне Івонкі Сурвілы, нагадаў аб гістарычных паралелях паміж Днём незалежнасці, які Латвія адзначае 18 лістапада, і Днём Акту 25 Сакавіка.

А яшчэ гэты сакавіцкі вечар стаў падставай павіншаваць з юбілеямі Наталлю Камілеўскую — чалавека, без якога цяжка ўявіць кожную нашую імпрэзу. Гэта магчымасць сказаць цёплыя словы падзякі ў адрас 80-гадовай юбіляркі, доктара гістарычных навук, старшыні латвійскага адзялення Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў прафесара Ілгі Апінэ. Гэта магчымасць паслухаць маладую таленавітую спявачку Людмілу Ігнатаву, беларуску, якая нарадзілася і вырасла на латвійскай зямлі, і сваімі выступленнямі далучае суродзічаў і да спрадвечных каштоўнасцей нашага народа, і да музычных шэдэўраў еўрапейскай культуры. Гэта і нагода пагаварыць аб тым, якімі справамі будзе адзначаць свой юбілей таварыства „Сьвітанак”, якому 27 лістапада бягучага года споўніцца дваццаць гадоў.

Дарэчы, шмат хто з гасцей свята вяртаўся дамоў не з пустымі рукамі, а са свежымі нумарамі газеты „Ніва”. Тыднёвік беларусаў Польшчы дасылаецца ў наша таварыства не першы год. І гэта таксама традыцыя — „Ніва” разам з намі на ўсіх нашых святах.

Нягледзячы на сумныя гістарычныя рэаліі, светлай і жыццясцвярджальнай атрымалася гэтая імпрэза. Гэта светлая ўзнёсласць — ад фарбаў нашых мастакоў, ад кранаючых сэрца гукаў беларускіх спеваў, ад нашай еднасці. Яна — у нашых сэрцах і пачуццях, у подыху вясны, у твары святой Ефрасінні Полацкай, заступніцы зямлі беларускай — яе выява, створаная мастаком Васілём Малышчыцам, асняла і нашую вечарыну, і выставу аб’яднання „Маю гонар”, якая будзе доўжыцца яшчэ і ўвесь красавік.

Беларусь, беларусы...

У цяперашні час у Беларусі не надта многа гавораць з высокіх трыбун аб рэпрэсаваных і закатаваных савецкай уладай беларусаў. Хутчэй назіраецца адваротнае — лукашэнкаўскія ўлады з большым імпэтам імкнуцца рэабілітаваць Сталіна. З таго пастаянна ламаюцца крыжы ў Курапатах, а даваенная граніца ў Беларусі носіць „ганарлівую” назву „Лінія Сталіна”. Але далёка не ўсім такі стан рэчаў да спадобы, і яны не хочуць, каб былі забыты тысячы імёнаў тых, хто прыняў сваю пакутніцкую смерць з рук бальшавіцкіх злодзеяў.

Дзякуючы інтэрнэту, тое, што не заўсёды сустрэнеш на паліцах беларускіх магазінаў, можна ўбачыць на старонках разнастайных сайтаў. Праўда, не ўсе выглядаюць так добра зробленымі як сайт Леаніда Маракова, дзе змешчаны сабраныя ім вялікія спісы імёнаў рэпрасаваных нашых продкаў.

Калі цікаўны карыстальнік набярэ на сваім камп’ютэры адрас **http://www.marakou.by**, то перад яго вачыма адкрыецца неардынарна зробленае выяўленнне першай старонкі. Уверсе вялікімі літарамі напісана „Леанід Маракоў”, ніжэй прывітанне да наведвальнікаў сайта, а з левага боку выйсці да іншых рубрык партала. Але гэтым выяўленне не заканчваецца. Пад усім гэтым бяжыць стужка з імёнамі і фотаздымкамі тых культурных і грамадскіх дзеячаў, якія былі расстраляны ў Мінскай унутранай турме НКВД 29/30 кастрычніка 1937 года. Яшчэ ніжэй месцяцца электронныя версіі трох вялікіх даведнікаў, якія былі састаўлены Леанідам Мараковым.

Аб тым, што такая вялікая праца з большага праведзеная аўтарам не столькі для загінуўшых, колькі для тых, хто сёння мае магчымасць радавацца жыццю, сведчыць прывітальнае слова Леаніда Маракова да інтэрнэт-карыстальнікаў. „Паважаныя сябры! — піша ён. — Вы зайшлі на адзіны ў свеце сайт, дзе размешчаны біяграфіі нашых продкаў — пакутнікаў, расстраляных або закатаваных у турмах НКВД, і тых нямногіх, што пакалечанымі вырваліся з ленінска-сталінскіх канцлагераў. Гэта больш за 4000 настаўнікаў, 3000 каталіцкіх і праваслаўных святароў, 1500 медыцынскіх і ветэрынарных работнікаў, больш за 1000 літаратараў і навукоўцаў, многія тысячы іншых дзеячаў культуры, грамадства, прамысловасці Беларусі. У бліжэйшыя часы планую пазнаёміць вас з біяграфіямі 20000 рэпрэсаваных беларускіх інтэлігентаў, а гэта фактычна ўся інтэлектуальная эліта крывавых 1920—1950-х гадоў. Памяць пра нашых продкаў — падмурак, на якім мы зможам бараніць будучыню Беларусі, яе Свабоду і Незалежнасць! Зычу вам, сябры, шчасця, здароўя, і галоўнае — дачакацца... Не! Змагацца за вольную Беларусь!”

Зважаючы на сённяшнія прасталінскія памкненні лукашэнкаўскай улады, можна сказаць, што Леанід Маракоў знаходзіцца на першым флангу гэтага змагання.

Перад тым, як перайсці да азнаямлення з рубрыкамі сайта, варта адзначыць цікавую опцыю на ім. Калі ў карыстальніка з’явілася жаданне знайсці кагосьці з рэпрасаваных, то ён можа занесці яго прозвішча ў пошук. У выпадку, калі яно будзе на сайце, то праз імгненне з’явіцца перад вачыма інфармацыя з кароткімі біяграфічнымі звесткамі пра гэтага чалавека.

Што ж тычыцца іншых рубрык, то найбольшую цікавасць выяўляе старонка „Пра пісьменніка”, дзе можам пазнаёміцца з біяграфіяй Леаніда Маракова, а таксама „Рэцэнзіі”, у якіх месціцца крытыка да пабачыўшых свет даведнікаў.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

„Керамін” — чэмпіён

Напэўна не прагадала вядомая беларуская фірма па вытворчасці кафлі і сантэхнікі „Керамін”, калі пастанавіла стаць тытульным спонсарам аднайменнай хакейнай каманды. Прынамсі другі раз у гісторыі „драконы” (такі талісман у гэтага хакейнага калектыву) становяцца чэмпіёнамі Беларусі. 4 тытулы на рахунку мінскага „Цівалі”, якое ўжо даўно не існуе, па 3 — гродзенскага „Нёмана” і мінскага „Юнацтва, 2 — наваполацкага „Паліміра”, па 1 — „Гомеля” і сталічнага „Дынама”.

У паўфіналах нечаканасцей не здарылася. „Керамін”, які выйграў рэгулярны чэмпіянат, з сухім лікам у серыі адолеў „Віцебск” (які, безумоўна, можа таксама занесці сабе гэты сезон у актыў) — 3:0, а „Юнацтва” з тым жа вынікам даказала сваю перавагу над мінулагоднім лаўрэатам — сталічным „Дынама”. Фінальная серыя змагання керамінаўцаў з „Юнацтвам” відавочна расчаравала не толькі заўзятараў апошняга, але і ўсіх, хто прагнуў інтрыгі ў бітве за золата. Бітвы насамрэч не атрымалася, хоць „юнакі” і супраціўляліся, падначаленыя Андрэя Гусава выйгралі ўсе чатыры матчы суперфіналу — 2:1 і 2:1 на сваёй пляцоўцы, 5:1 і 2:1 на чужой. Апанент Гусава — трэнер Міхаіл Захараў так і не знайшоў тактычных козыраў.

Найбольшы розгалас выклікала апошнім часам закулісная падзея — стварэнне расійскай Кантынентальнай хакейнай лігі (КХЛ). І хоць яе фармат пакуль да канца невядомы, заяўлена, што ўжо з гэтай восені ўдзел у ёй возьме і адзін беларускі клуб. Пад гэты праект мяркуецца стварыць зусім новую каманду, у якой будуць сабраныя мацнейшыя хакеісты Беларусі. Што з гэтага атрымаецца, пакуль невядома. Не страціць бы тое, што маем. Дадам, што ўдзел у новай КХЛ збіраюцца ўзяць і Латвія з Казахстанам. А астатнія беларускія і латышскія каманды напэўна аб’яднаюцца ў супольную лігу.

Між тым зборная Беларусі пад кіраваннем амерыканца Курта Фрэйзера распачала падрыхтоўку да чэмпіянату свету, які пройдзе сёлета ў Канадзе. Першыя спарынгі ў Чэхіі з нацыянальнай дружынай гэтай краіны прынеслі расчараванне. Дзве паразы ў таварыскіх гульнях — 2:7 і 1:7 насцярожваюць. Аднак, заўважым, што каманда гуляла па сутнасці рэзервовым складам, без многіх мацнейшых хакеістаў.

Добрыя навіны наконт цэнтрфорварда Аляксея Калюжнага, аднаго з лепшых бамбардыраў расійскага рэгулярнага чэмпіянату ў суперлізе. Ранні вылет яго клуба — омскага „Авангарда” з плэй-оф — дазволіў яму вызваліцца з месца асноўнай працы. Неўзабаве Калюжны пасля некалькіх гадоў перапынку далучыцца да зборнай Беларусі. А вось галкіпер Андрэй Мезін, які нядаўна развёўся з жонкай, хутчэй усяго на гэты раз не прыедзе.

У парадку справы ў нашых заакіянскіх легіянераў. Руслан Салей пасля трэйду з „Фларыды” ў „Каларада” ў спартовым плане толькі выйграў, бо ранейшы клуб нашага абаронцы ў плэй-оф не трапіў, а вось новы ўжо забяспечыў сабе там месца. Ну а манрэальскае трыо працягвае папаўняць свой ачковы баланс. Радуе тое, што Міхаіл Грабоўскі заслугоўвае ўсё большага даверу трэнераў „Манрэалю”, які змагаецца за першае месца ва Усходняй канферэнцыі. А старэйшы з братоў Касціцыных, Андрэй, перапісаў чарговы рэкорд беларусаў у НХЛ — на яго рахунку ўжо 53 ачкі (ранейшае дасягненне Уладзіміра Цыплакова было 52 пункты ў сезоне 1997/98). Удзел „энхаэлаўцаў” у чэмпіянаце свету будзе залежаць ад выступу іх клубаў у плэй-оф.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Пра „Ніву” і „тутэйшых”...

Штуршком для гэтай публікацыі стаў допіс Мікіты Дразда „З кожным годам «Ніва» прыгажэе” („Ніва” № 11 ад 16 сакавіка г.г.), у якім аўтар дае не толькі станоўчую ацэнку часопісу, але і паказвае рэцэпт як паўплываць, каб „Ніва” стала больш даступнай і гасцявала ў кожнай хаце. Ідэю лічу цікавай і таму, як шматгадовы карэспандэнт, рашыўся і я ўключыцца ў дыскусію.

Пагаджаюся з аўтарам, што „Ніва” прыгажэе, набірае колераў, што прыбывае новых аўтараў і карэспандэнтаў. Пагаджаюся і з фактам, як прыкмячае паважаны калега, што гэтых апошніх надта мала. На думку спадара Дразда, яны павінны быць у кожнай большай вёсцы, у кожнай гміне, каб „апісваць сённяшняе жыццё нашых людзей, іх мінулае, гісторыю нашых продкаў”. Пад гэтай думкай падпісваюся абедзвюма рукамі. Прызнаюся шчыра, што даўней так было. Дастаткова пагартаць старонкі тыднёвіка шасцідзесятых-сямідзесятых гадоў і зразу выявіцца, якою колькасцю супрацоўнікаў карысталася „Ніва”, аб чым пісала ды хто чытаў родны часопіс. А зараз што маем? На пальцах адной рукі можна палічыць ніўскіх „ветэранаў”. Ці не варта задумацца, даражэнькія, над праблемай адсутнасці даўнейшага „авангарду”? Мне здаецца, што прычыну трэба шукаць у абыякавасці беларусаў да сваёй тоеснасці. Хопіць агледзецца навокал ды пацікавіцца як да гэтай справы ставяцца кіраўнікі мясцовых самаўрадаў (праваслаўныя, разумеецца) у сваёй Малой айчыне, Падляшшы. Не пачуеш ад іх слова на мясцовай гаворцы. Ды не толькі ў канторах, але і штодзень, паміж сабою. Нядаўна ўдзельнічаў я ў вёсцы Чаромсе ў шматлюднай імпрэзе, у якой прысутнічалі прадстаўнікі гміннай адміністрацыі з войтам на чале. І хоць кампанія ў дзевяноста дзевяці працэнтах лічылася „тутэйшай”, выступленне войта ды лідэра гмінных пенсіянераў (радавітага, зрэшты, чарамшаніна) прагучалі на польскай мове. А ці нельга было ў гэтым коле некалькі слоў сказаць па-свойму? Такіх прыкладаў хоць адбаўляй. Глядзеў я ў нядзелю (30 сакавіка) праграму „Беларускі тыдзень”, у якой журналіст пытаў суразмоўцаў пра іх паходжанне. Кожны з апытаных прызнаваў сябе праваслаўным і „тутэйшым”, аднак не беларусам. Ды і з супрацоўнікамі „Нівы” справа не лепш маецца. Ад даўжэйшага часу прыкмячаю публікацыі падпісаны клічкамі або мянушкамі. Чаму аўтар не падпісваецца сваім прозвішчам? Няўжо сароміцца выявіць праўду, што супрацоўнічае з беларускай „Нівай”?

Дзе падзеўся Мікалай Панфілюк з Дубіч-Царкоўных? — пытае аўтар тэксту. Ці „Ніва” пацікавілася ягоным лёсам? А што з Грышам Марозам, Маркам Цыбартам? Гэтыя карэспандэнты праяўлялі ў мінулым актыўнасць у супрацоўніцтве з рэдакцыяй і, на маю думку, нельга пакідаць іх самім сабе. Няўжо, паважаныя калегі, не хапае Вам тэм для допісаў? Паспрабуйце аглянуцца па наваколлі і паслухаць, што „ў траве пішчыць”. Тэмаў хоць адбаўляй, каб толькі пісаць была ахвота. Але з гэтым у нас усяляк бывае. Спадзяюся, што неўзабаве адгукнуцца калегі па пяру з кола даўнейшага авангарду. „Ніва” такою будзе, якую мы самі створым. А за змест допісаў ў „Ніве” варта спрачацца. Карэспандэнты і журналісты больш павінны даваць публікацый паводле крытэрыяў Мікіты Дразда, значыць, апісваць нашых людзей, іх мінулае і гісторыю нашых продкаў, а не адно карміць чытачоў палітыкай, гараскопамі ці беларускім спортам. Толькі такім чынам і пры ўліку голасу народа супольна дасягнем мэту.

Уладзімір СІДАРУК

Падарожжа на школьным аўтобусе

Аднойчы мне была патрэба дабрацца ў гміну, а каб даехаць туды, неабходна сесці на школьны аўтобус, бо ПКСаўскія аўтобусы адмянілі. Школьны аўтобус з Нарвы едзе праз вёскі Рагазы-Іванкі, Агароднікі, Гозна Міхалоўскай гміны, Бялкі, Трасцянка, Анцуты, Адрынкі, Гарэнды і Ванева і выязджае на шашу каля каталіцкіх могілак, калі глядзець ад шашы — з левага боку. Хоць праедзеш каля адной трэці тэрыторыі гміны, пакуль дабярэшся ў самую Нарву, дык хоць пабачыш, як выглядаюць сучасныя вёскі на ўсходняй сцяне.

І так пачну ад вёскі Рагазы-Іванкі, бо іх дзве раздзяляе крыж, які стаіць на вуліцы. Вёска прыгожа ўпарадкаваная — прыгожыя дамы, агароджы і ёсць тут дзве фермы, у якіх гадуюцца больш за сто штук дойных кароў, апрача таго маладняк. Дзейнічае тут пункт скупкі малака. Крама пустуе. Вёска Агароднікі — невялікая, але шмат сялян жыве на хутарах і добра яны гаспадараць. У вёсцы ёсць ферма малочных кароў і маладняку каля ста штук, на калоніі ў напрамку Гознай працуе вялікая гусіная ферма. У вёсцы Гозна Міхалоўскай гміны, з якой дзеткі даязджаюць у нарваўскую школу, таксама на ферме трымаюць гусей. Пра маю вёску Бялкі можна сказаць што гэта вёска пенсіянераў. Тут толькі шэсць гаспадароў пастаўляе малако ў злеўню ў вёсцы Трасцянка, якая змяшчаецца пры краме спадара Аляксандра Астроўкі. У вёсцы крама пустуе. Злеўню малака гміна купіла на святліцу для вёскі і для перахоўвання прылад добраахвотнай пажарнай каманды. Шырэй разгорнутай гаспадаркі няма. Вёска Трасцянка. Уязджаючы ад Заблудава леваруч відаць вялікую ферму з гадоўляй мясцовага быдла і маладняку ды гусятнік. Самую вёску называюць спальняй горада Беластока, бо калінебудзь якая сядзіба ці хата прадаецца, то зараз знойдуцца на іх пакупнікі з горада. На такую вялікую вёску як Трасцянка ніхто не мае ўмяшчальніка малака, а ў злеўню здаюць малако, можа сказаць, адны пенсіянеры, якія паперапісвалі свае гаспадаркі на дзяцей. Толькі работы не перапісалі, бо тыя дзеткі жывуць у горадзе і сваімі гаспадаркамі мала цікавяцца. Вёска Анцуты — у ста працэнтах каталіцкая, мяжуе ад поўдня з лугамі над ракой Нарвай, ад яе поўначы — шаша Заблудаў — Нарва. Працуе тут куратнік, дзе гадуюць курэй-бройлераў. Вёска прыгожа ўпарадкаваная. Вёска Адрынкі таксама акуратная і гаспадары тут, як відаць, ёсць — маюць фермы гадоўлі малочных кароў ды гусей. Краму, якую пабудаваў тут Канстанцін Майсеня, пры рыначнай эканоміцы адкупіла гміна і перарабіла яе на пажарнае дэпо. Далі пажарнікам аўтамашыну „Жук”. У вёсцы працуе прадуктовая крама. Вёска Гарэнды — прыгожая ды ціхая. Распаложана яна недалёка ад вёскі Адрынкі ды ракі Нарвы. Ёсць тут некалькі ўзорных гаспадароў, гадуюць яны малочных кароў, маюць уласныя ўмяшчальнікі малака. Вельмі прыгожыя тут дамы з альтанкамі. Пад'язджаючы пад вёску Ванева я падумаў, што ўязджаю ў нейкі „пэгеэр”. Тут відаць сучасныя аборы, дзе гадуюць малочнае быдла. Відаць шмат сельскагаспадарчых машын, трымаюцца яны ў добрым парадку — аж прыгожа на гэта ўсё паглядзець...

І так, пакуль я дабраўся ў Нарву, каб у гміннай управе аформіць сваю неабходную справу, быў вымушаны праехаць амаль чвэрць тэрыторыі гміны, а потым вельмі старацца, каб вярнуцца ў Трасцянку перад гадзінай 9.45 — тады едзе адзіны аўтобус цераз мае Бялкі з Беластока ў Бельск-Падляшскі. Вось як закончылася маё падарожжа на школьным аўтобусе ў гмінную Нарву. Хоць дарога была доўгая, наведаў я многа вёсак ды пабачыў як жывуць людзі.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Адгаданка



1. буйны заходнеўкраінскі горад, 2. абласны ўкраінскі горад на Паўднёвым Бугу, 3. конская „прычоска”, 4. буйны заходнебеларускі горад, 5. атрута, 6. оперная песня, 7. напр. Гродна, Вінніца, Львоў, 8. напр. Ілья, Елісей, Ісаія, 9. гульня са слупкамі, якія з пэўнай адлегласці збіваюцца шаром, 10. усходнесібірская рака, якая ўліваецца ў мора Лапцевых, 11. узятая пазыка, абавязак, 12. падбеластоцкі горад, дзе друкавалі Пётр Мсціславец і Іван Фёдараў, 13. сталіца Украіны, 14. група навучэнцаў, якія адначасова канчаюць навучальную ўстанову, 15. вялікая ўсходнеазіяцкая гранічная рака, 16. не мір, 17. Пятрусь, беларускі паэт (1905-80), 18. хімічны элемент Sn, 19. не *картошка*, 20. верш Янкі Купалы (*Кукавала зязюля*...), 21. гарадскі пасёлак пры ўпадзенні Друйкі ў Дзвіну.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — кітайская прыказка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 10 нумара

Ват, віза, дзея, дыёд, Зея, леў, Навагрудак, соль, Тураў, шаман, Шырма.

Рашэнне: **На гару вядзе шмат маршрутаў, але від з яе заўсёды аднолькавы.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Галене Тапалянскай** з Трасцянкі і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.

Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: II kwartał 26 zł. do 5 marca 2008 r; III kwartał 26 zł. do 5 czerwca 2008 r.; IV kwartał 26 zł. do 5 września 2008 r. II półrocze 52 zł. do 5 czerwca 2008 r. II — IV kwartał 78 zł. do 5 marca 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.
Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/ Warszawa,
Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.

Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy” w 2008 roku — 52.
Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł. **Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 750 egz.

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Таленты ў чамадане

Людзі хутка ходзяць па вуліцы, сярод іх на зямлі стаіць чамадан, сучасная музыка, колеры, натоўп, у пэўны момант малады чалавек, праходзячы, падымае чамадан, праз хвіліну мы ўжо перад Камароўскім рынкам у Мінску — так пачынаецца адзін з фільмаў, якія беластоцкая публіка глядзела ў чацвер, трэцяга красавіка, у клубе „Фама". Беластоцкі асяродак культуры час ад часу запрашае жыхароў горада на фільмавыя падарожжы па суседніх краінах. Цяпер прыйшла чарга на Беларусь.

Не так лёгка наладзіць паказ беларускіх незалежных фільмаў. Пераканаліся ў гэтым арганізатары, якія паспелі ўжо пару разоў прэзентаваць фільмавы андэграўнд маладых чэхаў, літоўцаў ці латышоў. Дагэтуль цяжка было знайсці маладых людзей, якія наогул у сваёй хаце мантуюць тое, што ўдалося ім запісаць на фільмавай плёнцы або на сваёй партатыўнай лічбавай камеры. Па гэтай прычыне сінонімам незалежнага беларускага кіно з'яўляўся Андрэй Кудзіненка, аўтар фільма „Mysterium occupation". Аказваецца, што час нясе з сабой змены і сёння, калі добра пашукаць, можна знайсці і іншыя праявы незалежнага мастацкага жыцця. Пакуль што гледачам у клубе „Фама" прэзентаваліся маладыя творцы з Мінска ды Гродна. Можна было пабачыць фільмы інспіраваныя штодзённасцю, кароткія сюжэты, відэаарты ці відэа да песень беларускіх гуртоў.

— Калі я пабачыў фільмавыя працы старэйшых сяброў, падумаў: „Чаму я не магу зрабіць лепш". І так пачалося, — распавядае Арцём Лобач, малады рэжысёр з Мінска. — Натхненне шукаю ў жыцці сваім і сваіх сяброў, сачу, цэлы час назіраю. Таму і паўстаў фільм „Backside". Бачу сваіх сяброў, якія зарабляюць грошы, але не займаюцца тым, пра што мараць. Свае таленты носяць яны ўвесь час пры сабе, у чамадане, але не заўсёды маюць адвагу ім паддацца.

Арцём у Беласток таксама ўзяў камеру.

— Я ўпершыню на Захадзе, але ўжо бачу, што мяняецца мой пункт гледжання. Запісваю камерай рэчаіснасць, а пасля пабачу, што з гэтага атрымаецца.

Разам з Арцёмам на паказ прыехала таксама Юлія, дзяўчына з Гродна. Яна — заснавальніца першага дыскусійнага фільмавага клуба ў сваім горадзе, а калі глядзець як сур'ёзна падыходзіць яна да гэтага занятку, мабыць, у будучыні будзе ўзначальваць самы актыўны фільмавы клуб.

— Калі я зараз гляджу, што адбываецца ў Польшчы, Латвіі і іншых краінах Еўропы, набіраю ахвоты вяртацца і ісці далей з працай нашага клуба, — кажа Юлія. — У нашым кінаклубе сустракаецца каля 40 чалавек, на жаль толькі 10 асоб правярае сябе за камерай. Кожную нядзелю глядзім класіку кіно, а недзе два разы ў тыдзень глядзім працы маладых беларусаў. Шчасліва прыйшла ўжо вясна, таму прац будзе больш, бо маем намер рэалізаваць новыя ідэі. Перш за ўсё хочам пайсці ў горад і паказаць, як бачым сваё Гродна.

Паказы фільмаў гэта не адзіная цікавінка ў час еўрапейскіх вандровак па таямніцах незалежнай культуры. Галоўнае пытанне: што паказаць новае, свежае. Беларусь гэта краіна перш за ўсё рок-музыкі. Можа не таму, што яна сама лепшая ў свеце, але напэўна таму, што асацыюецца з імкненнем да незалежнасці. Вядома аднак, што альтэрнатыўная культура ў року не заключаецца, а хутчэй ім інспіруецца. Так яно ёсць у выпадку

Юлія з Гродна — заснавальніца першага дыскусійнага фільмавага клуба ў сваім горадзе

брэсцкага праекта „!Wanted". Гэта двух хлопцаў, ці лепш сказаць мужчын, бо адзін з іх ужо бацька і настаўнік гісторыі. Мабыць таму ў іхняй творчасці знаходзім гістарычны ўхіл. Ён відавочны, калі паслухаем тэксты, у якіх выкарыстоўваюцца прымаўкі, дыялектныя словы ці сказы. З другога боку яны таксама ангажаваныя

ў грамадскае жыццё. На сайце гурту знаходзім, між іншым, інфармацыю пра няшчасны лёс старых, брэсцкіх будынкаў.

— Камерцыя сёння мае першаснае значэнне і таму ніхто, ні гарадскія ўлады, ні культурныя арганізацыі не займаюцца захаваннем хаця б таго, што засталося.

Паколькі „!Wanted" яшчэ не выдалі дэбютнага альбома, то дзякуючы канцэрту ў Беластоку круг іх фанатаў напэўна пашырыўся.

Мерапрыемства закончылі музыкі, але варта звярнуць увагу на тое, што яго пачало і мае нейкае дачыненне да музыкі. Пакуль увагу гледачоў прыцягнулі фільмы, маглі яны пабачыць паказ камп'ютэрных графік Ігара Варашкевіча — вакаліста легендарнага беларускага гурту „Крама".

— Я па адукацыі мастак, але так склалася, што ўсё жыццё займаюся музыкай, — сказаў Ігар Варашкевіч. — Проста купіў я камп'ютэр і пачаў маляваць. Каб хтосьці яшчэ год таму сказаў мне, што буду маляваць, то паслаў бы я яго на тры літары.

Не толькі Ігар Варашкевіч сваімі творчымі ідэямі прыцягнуў аматараў мастацтва. Гасцей віталі вобразы з жыцця Беларусі, галоўнымі героямі якіх былі людзі. Менавіта яны найбольш цікавяць аўтара здымкаў Андрэя Лянкевіча. Звычайна ягоныя здымкі публікуюцца ў мінскай „Нашай ніве", але свае фотарэпартажы рыхтуе ён таксама для іншых часопісаў у цэлым свеце. Выстаўка здымкаў, якой адкрыццё адбылося 25 сакавіка, паказвае розныя спосабы гле-

джання на беларусаў і іх свет.

„А ты, старык, куды?" — пыталі арганізатары мерапрыемства наведвальнікаў клуба „Фама". Пыталі таму, што такі загаловак мела мерапрыемства. Думаю, што пасля такой прэзентацыі беларускай культуры, ніхто без задумлівасці не спытае „камо грядеши Беларусь?", бо гэта было дакладна відавочна. Цешыць, што пры гэтай нагодзе сваю крэатыўнасць паказала таксама Беларускае аб'яднанне студэнтаў.

13.04 — 19.04

(22.03. — 20.04.) Не будзеш замоцна дбаць аб сваю сувязь у пары. Затое на працы раскінеш крылы. Выкарыстай гэты час, бо прыйшлі твае пяць хвілін! Клапатліва заапякуешся тымі, каму гэта патрэбна.

(21.04. — 21.05.) У тваёй галаве час не на амуры! Будзеш сур'ёзны і патрабавальны. На працы кіруйся інтуіцыяй. Будзеш цяпер настроены больш кампанейска, ды трымайся за кішэню (твае апаскі навырост — хопіць грошай!).

(22.05. — 22.06.) Не будзеш доўга чакаць творчай інспірацыі. Інтуіцыя падсуне табе найлепшыя вырашэнні і прыёмы. Можаш шмат выдаць, але і заробіш нямала. У пастаянных парах можа закіпець! Ды не перабольшвай праблем і не шукай дзіравага ў цэлым!

(23.06. — 23.07.) У пачуццях адкрыйся на змены. На працы няма табе роўных, энергія аж распірае цябе. Здзяйсняюцца твае прафесійныя амбіцыі. Можаш быць лішне патрабавальны да партнёра. У хаце захочаш усё расставіць на сваіх месцах. Слухай разумных кабет, асабліва са знакаў Барана і Казярога!

(24.07. — 23.08.) Узрастаюць твае ўражлівасць і інтуіцыя. Твае выбары будуць надзвычай трапнымі. З 18.04. небывалыя поспехі на працы (тваім козырам будуць сіла пераконвання і індывідуальнасць).

(24.08. — 23.09.) З 15.04. пераможаш усе перашкоды. Без цяжкасцей аформіш усё запланаванае. Лёгка дойдзеш да мэты, моцна станеш перад апанентамі. Можаш здабыць нават еўрасаюзныя сродкі. Ды спачатку знайдзі добрага дарадчыка.

(24.09. — 23.10.) З 18.04. у тваю галаву будуць залятаць сто ідэй на хвіліну! Усе добрыя! Праўда, не ўсе зрэалізуеш, ды рушыш з месца! У гонках за лепшую пасаду можаш перамагчы канкурэнтаў. Шчасцю часам трэба памагчы, ды і цуды бываюць!

(24.10. — 22.11.) З 18.04. будзеш мець шмат цікавых ідэй, будзеш творчы, знакаміта дагаворышся з людзьмі. Пазнаёмішся з людзьмі, якія адыграюць у будучыні вялікую ролю ў тваім жыцці. Будзеш больш уладны і рашучы, акажаш вялікі ўплыў на людзей.

(23.11. — 22.12.) Замест разлічваць на галубінае сэрца партнёра, не давай яму больш падстаў да турбот. Пільнуй кашалька, бо можаш шмат страціць. Лішак работы можа вывесці цябе з раўнавагі, можаш кінуцца ўсляпую. Энергіі хопіць, ды глядзі, каб не змарнаваць яе на абы-што!

(23.12. — 20.01.) Адчуеш агромны прыліў творчых і жыццёвых сіл. За гэты час можаш аформіць мноства незвычайных ды цікавых спраў. Вельмі добры час на мерапрыемствы, якія патрабуюць спрыту, адвагі і рашучасці. Дасканалы час на размовы!

(21.01. — 19.02.) Вельмі працавіты час, ды дзякуючы гэтаму шмат спраў перасунеш наперад, падзейнічаеш у розных галінах, выкарыстаеш нагоды. Найважнейшыя для цябе цяпер — свабода і незалежнасць. Квітнее кампанейскае жыццё!

(20.02. — 21.03.) Удасца зрэалізаваць усё, што задумаеш! Мілыя людзі наўкола, вельмі добра ў грашах. Грошы плывуць струмянём, але роўна хутка могуць і адплысці! Добры настрой, схільнасць да жартаў. Цудоўны час у адносінах з сябрамі. Можаш сустрэць старое каханне; яно ж не ржавее!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960